ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 1 (4253)
Пятніца, 1 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Урадовая бібліятэка Гарнага
Ш 2666

ПАБУДАВАЎШЫ ФУНДАМАНТ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ Савецкі саюз і яго фарпост БССР УСТУПАЮЦЬ У ЧАЦЬВЕРТЫ, ЗАКЛЮЧНЫ ГОД пяцігадовага пляну вялікіх работ

„СА СЬЦЯГАМ ЛЕНІНА ПЕРАМАГЛІ МЫ Ў БАЁХ ЗА КАСТРЫЧНІЦКУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ,

СА СЬЯГАМ ЛЕНІНА дабіліся мы рашаючых посьпехаў у змаганьні за перамогу сацыялістычнага будаўніцтва, З ГЭТЫМ-ЖА СЬЦЯГАМ пераможам у пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце!" СТАЛІН

ГОД ЗАВЯРШЭНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ

ПРОЙДЗЕН яшчэ адзін этап барацьбы за сацыялізм. 1931 год быў годам новых буйнейшых паваротаў генэральнай лініі партыі, годам завяршэньня пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі. Ленінскае пытаньне «хто каго» і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы вырашана ў карысьць сацыялізму.

Такі асноўны вынік мінулага году для Савецкага Саюзу.

Зусім іншы малюнак па той бок барыкад — у краінах капіталу.

У нас — на аснове сацыялістычнай сыстэмы народнай гаспадаркі, абыдваецца магутны рэкэт вытворчых сіл краіны. у нас — шчучы энтузіязм будоўлі, стварэньне буйнейшых матар'яльных і культурных канцэнтрацый, шыхільны рост добрабыту шматмільённых працоўных мас. У нас поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе.

На аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі адбываецца бязупынны працэс узьніку нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу.

У лягеры імпэрыялізму абцугі крызісу сьціскаюцца ўсё мацней і мацней. Там—упадак, дэградацыя, руйнаваньне. Вытворчасьць скарачаецца. Народны даход у 1931 г. ва ўсіх капіталістычных краінах упаў на 10-20 проц. Беспрацоўе, абнішчэньне самых шырокіх мас дасягае шчуваных разьмераў.

Гонка за рынкамі, барацьба за перадзел і захват калёній і поўкалёній дасягнула найвышэйшага напружаньня. Капіталізм шукае выхаду з крызісу ў вайне.

Усё больш рэзка абвастраюцца супярэчнасьці паміж прапай і капіталам. Нарастае рэвалюцыянізаваньне найшырэйшых працоўных мас. Сусьветны пралетарыят пад сьцягамі Камінтэрну вядзе гераічнае змаганьне з капіталам, накапляе сілы для рашучых баёў за ўладу.

Фашысцкім тэрорам, расстрэламі, катаўскімі прысудамі і турмамі, узмацненьнем нацыянальнага прыгнечаньня буржуазія імкнецца загасіць рэвалюцыйны пажар, адтэрміноваць час свае пагібелі.

Вострасьць клясавай нянавісьці, усе сродкі барацьбы з камунізмам буржуазія накіроўвае на Савецкі Саюз — сацыялістычную бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету. Шалёнае цкаваньне СССР, простая падрыхтоўка інтэрвэнцыі яднае мэтамкненьні ўсіх імпэрыялістычных краін і груповак. На сьцягах капіталізму напісана вайна. Захват Манчжурыі—прыкрывавая прэлюдыя да буйнейшых імпэрыялістычных авантур, непарыўнае звяно падрыхтоўкі антысавецкай інтэрвэнцыі. Такі баланс капіталізму, баланс руіны крыві і глыбокага распаду.

1932 год зьяўляецца для Савецкага Саюзу годам вялізарнага гістарычнага значэньня. Ён завяршае сабою пяцігодку. Не за пяць, а за чатыры гады.

Гэта забясьпечана тымі вялізарнымі посьпехамі на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, якіх у папярэднія гады дабілася партыя па аснове сваёй генэральнай лініі, у бязьлітасным барацьбе з правым і «левым» апартуністам і прымірэнцтвам да іх.

Асабліва грандыёзныя нашы дасягненні ў закончаным 1931 г. Сацыялістычная прамысловасьць зрабіла гігантскі скачок наперад. У эксплёатацыю ўступілі новыя сусьветныя гіганты індустрыі (СТЗ, Харкаўскі трактарны, аўтазавод імя Сталіна. Магнітагорскі кокса-хэмічны камбінат і інш.).

Валавая прадукцыя прамысловасьці ўзрасла за год на 20-21 проц. — размах, аб якім не адважвалася нават марыць ніколі ні адна капіталістычная краіна.

Па важнейшых галінах прамысловасьці Савецкі Саюз апераджвае ўсе новыя і новыя капіталістычныя краіны. Вялізарныя посьпехі дасягнуты рабочай клясай у галіне барацьбы за эканамічную незалежнасьць СССР.

Бурныя тэмпы росту індустрыі забясьпечылі вялізарнейшае дасягненьне ў справе сацыялістычнай рэконструкцыі і тэхнічнага ўзбраеньня сельскай гаспадаркі, магутны рост МТС і ўкрупненьне гаўтасаў — гэтага «станавога хрыбта перабудовы старага ўкладу вёскі».

1931 год зьявіўся годам завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі ў асноўных збожжавых раёнах. З посьпехам ажыцьцяўляецца лёзунг ліквідацыі кулацтва як клясы.

Сацыялістычны сэктар заваяваў рашаючую ролю ў сельска-гаспадарчай эканоміцы. Калгасы сталі асноўным вытворцам ня толькі збожжа, але і важнейшага с.-г. сырцу. Калгасьнік ператварыўся ў цэнтральную фігуру земляробства, у моцную апору партыі і савецкай улады на вёсцы. Партыя на-баявому ажыцьцяўляе цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры брацкай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу, падыходзіць да новага гаспадарчага году таксама з вялізарнымі перамогамі. Вось асноўныя паказальнікі росту.

Народны даход за год узрос на 13-14 проц. Удзельная вага сацыялістычнага сэктару ў народным даходзе павялічылася на 15-20 проц. і дасягнула 75-80 проц. Валавая прадукцыя прамысловасьці ВСНГ і Наркамснабу БССР вырасла па 69 проц. Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць вырасьлі па 31,4 проц. і дасягнулі 87 млн. руб., у сельскай гаспадарцы — на 59,3 проц., што раўняецца 151 млн. руб. Фонд зарплаты павялічыўся на 53 проц. Агульная сярэдняя гадавая зарплата вырасла на 22,3 проц.

У калгасах аб'ядналася палова ўсіх бядняцка - серадняцкіх гаспадарак БССР, павысілася таварнасьць сельскай гаспадаркі. Пасеўная плошча пашырана на 5,5 проц. Значныя зрухі адбыліся па лініі спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, пашырэньня плошчаў пад тэхкультурамі (на 60 проц.).

Вялікіх посьпехаў БССР дасягнула ў разьвіцьці беларускай культуры — нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Адзначаючы сёньня 13-ю гадавіну ўтварэньня БССР у дзень ударніка рабочая кляса, калгасьнікі і бядняцка - серадняцкія масы Беларусі дэманструюць перад працоўнымі ўсяго сьвету і ў першую чаргу перад братамі па клясе—працоўнымі Заходняй Беларусі, якія стогнуць пад ярмом польскага фашызму, — свае вялізарнейшыя перамогі, сваю непахісную волю будаваць сацыялізм.

Год завяршэньня пяцігодкі зьяўляецца годам ажыцьцяўленьня грандыёзных праграм сацыялістычнага будаўніцтва, далейшага паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочай клясы і працоўных мас.

Пастановай ЦК УсеКП(б) разьмер капітальных затрат па ўсёй народнай гаспадарцы ў 1932 г. намечан у разьмеры 21 млдр. рублёў, супроць 16.100.000.000 руб. фактычных затрат 1931 году. Прырост аб'ёму прамысловай прадукцыі ўстаноўлен у 36 проц. Прадукцыйнасьць працы павінна ўзрасьці на 22 проц., зьніжэньне сабекошту прадугледжваецца на 7 проц. Выраб прадметаў шырокага спажываньня павялічваецца на 29 проц., значна ўзрастае харчовая прамысловасьць.

«Няма ніякіх сумненьняў у тым, што 1932 год будзе годам завяршэньня ў асноўным калектывізацыі па СССР у цэлым» (Молатаў).

У БССР прырост валовай прадукцыі праектуецца ў разьмеры 68,6 проц. Прадукцыйнасьць працы павінна ўзрасьці па прамысловасьці ВСНГБ на 26,9 проц. і па НКСнабе—на 26 процантаў. Заданьне па зьніжэньні сабекошту вызначана ў 8,1 проц. па прамысловасьці ВСНГ і ў 7 проц. — па прамысловасьці Наркамснабу.

Рэалізацыя народна - гаспадарчага пляну апошняга году пяцігодкі патрабуе поўнага напружаньня сіл рабочай клясы і ўсіх яе арганізацый, далейшага масавага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Патрэбна бальшавіцкая барацьба за ленінскі стыль у рабоце, за баявыя тэмпы, за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў тэхпрамфінпляну, за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, за зьніжэньне сабекошту, за карэннае паляпшэньне якасьці прадукцыі, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, за павялічэньне ўнутрыпрамысловых накапленьняў.

Штодзенная ўпартая работа па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў — гэта вось, вакол якое павінны канцэнтравацца ўсё пытаньні сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. КП(б)Б вядзе і будзе весьці самую жорсткую барацьбу з апартуністычным ігнараваньнем гэтай цэнтральнай задачы, з найменшымі спробамі пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі.

У новым гаспадарчым годзе з асаблівай вострасьцю паўстае праблема карэннага павышэньня якасьці работы чыгуначнага і воднага транспарту, рэконструкцыі яго тэхнічнай базы, поўнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў.

Ва ўсю шырыню паўстае задача разгортваньня таваразвароту, узьдыму на вышэйшую ступень савецкага гандлю, далейшай перабудовы каапэрацыі. Пытаньні спабжэньня, агульнага паляпшэньня матар'яльных і бытавых умоў рабочай клясы павінны быць узяты пад неаслабны кантроль партарганізацый, як адна з асноўных задач, непасродна зьвязаных з усім сацыялістычным будаўніцтвам.

КП(б)Б дабілася буйнейшых посьпехаў у галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Цьвёрда праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку, КП(б)Б разграміла контр-рэвалюцыйны нацыянал - дэмакратызм, вяла і вядзе самае бязьлітаснае змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, з нацыянал-апартуністам.

Далейшая непрымірымая барацьба з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі і ў першую чаргу—з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай, зьяўляецца адной з рашаючых умоў нашага руху наперад.

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пралетарской рэвалюцыи» абавязвае ўсе партарганізацыі ўдзесьцярыць сваю клясавую пільнасьць да спроб працягваньня трацкісцкай контрабанды, да праяўленьняў гнілога лібералізму і прымірэнцтва да іх, яшчэ больш непрымірымна павесьці барацьбу з усякага роду апартунізму у тэорыі і на практыцы.

Усё ўзрастаючая небясьпека нападу на СССР, антысавецкія правакацыі на Ўсходзе патрабуюць ад усіх партарганізацый і кожнага камуніста самых уважлівых адносін да пытаньняў умацаваньня абароназдольнасьці краіны, да ўзьняцьця баяздольнасьці Чырвонай арміі. Сацыялістычнае будаўніцтва і яго абарона—неадлучны.

Такавы асноўныя задачы, што стаяць перад намі ў апошнім годзе пяцігодкі. Яны грандыёзныя, але зусім рэальныя.

Правядзеньне іх у жыцьцё магчыма толькі па аснове бальшавіцкай, непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, і «левага» ухілу супроць прымірэнцтва да іх.

Ключ да вырашэньня гэтых задач —у рэалізацыі шасьці гістарычных умоў т. Сталіна. Іх практычнае ажыцьцяўленьне прынесла ўжо вялікія зрухі ў рабоце прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадаркі. Поўнае іх ажыцьцяўленьне забясьпечыць бязумоўнае выкананьне народна-гаспадарчага пляну.

Са сьцягам Леніна, пад выпрабаваным кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе Цэнтральнага Камітэту, на чале з правадыром тав. Сталіным, рабочая кляса Савецкага Саюзу—ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту — выканае пяцігодку за чатыры гады, пераможным поступам пойдзе па шляху пабудовы ў нашай краіне сацыялізму, яшчэ больш гэтым узмоц ніць пазыцыі рабочае клясы ўсіх краін, міжнароднай сацыялістычнай рэвалюцыі.

ПЕРАМОЖЦЫ трэцяга рашаючага

НА АСНОВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ В УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА ПЕРАДАВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БССР ДА ТЭРМІНУ ВЫКАНАЛІ ПРАМФІНПЛЯН ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ.

ВОСЬ ЯНЫ, ЛЕПШЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ:

1. МЕНСКАЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЯ ГАРБАРНЯ «БАЛЬШАВІК» ДА 4 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ. САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ ЗА 10 МЕСЯЦАЎ ЗЬНІЖАН НА 11 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 4,2 ПРОЦ. ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ.

2. МЕНСКАЯ ШЧОТАЧНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН 3-ГА РАШАЮЧАГА 5 СЬНЕЖНЯ — НА 28 ДЗЁН РАНЕЙ ТЭРМІНУ.

3. ФАБРЫКА «ЎТЫЛЬСЫРЭЦ» (МЕНСК) ВЫКАНАЛА ГАДАВОЕ ВЫТВОРЧАЕ ЗАДАНЬНЕ 10 СЬНЕЖНЯ. САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ ЗЬНІЖАН НА 2,3 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 2 ПРОЦ. ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ.

4. ГОМЕЛЬСКАЯ ФАБРЫКА ПА АПРАЦОЎЦЫ ФУТРАВЫХ АЎЧЫН «ПРАЛЕТАРСКІ ШЛЯХ» ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН 13 СЬНЕЖНЯ.

5. МАГІЛЕЎСКАЯ МЯБЛЕВАЯ ФАБРЫКА ВЫКАНАЛА ГАДАВОЕ ВЫТВОРЧАЕ ЗАДАНЬНЕ ДА 19 СЬНЕЖНЯ.

6. СКАРНЯЖНАЯ Ф-КА (МЕНСК) 27 СЬНЕЖНЯ РАПАРТАВАЛА АБ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ГАДАВОЙ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ.

7. МАГІЛЕЎСКАЯ ГАРБАРНЯ ІМЯ СТАЛІНА 28 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН.

8. МАГІЛЕЎСКІ ХЛЕБАЗАВОД ДА 29 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАЎ КОЛЬКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ПЛЯНУ 1931 Г.

9. РАГАЧОЎСКАЯ КАРДОННАЯ ФАБРЫКА ДА 30 СЬНЕЖНЯ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПРАМФІНПЛЯН НА 100 ПРОЦ. СУТАЧНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА НА 21-22 ПРОЦ

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

ПЕРАДАВЫЯ САЎГАСЫ, КАЛГАСЫ, СЕЛЬСАВЕТЫ І РАЁНЫ РАПАРТУЮЦЬ АБ ПАСЬПЯХОВЫМ ЗАВЯРШЭНЬНІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

РАЁН	Проц. выкананьня гад. збожжазаг. пляну на 25-XII.
Сураскі	152,6
Гомельскі	121,3
Лёзьнянскі	113,0
Сіроцінскі	103,8
Уваравіцкі	101,6
Жытковіцкі	101,5
Сеньненскі	100,0

УДАРНІКІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

ВОРША. Калгас «Новы быт», Яронскага сельсавету, на 25 сьнежня поўнасьцю выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Заданьне па збожжы калгас выканаў на 100 проц., па ільнасемі—на 175 проц. і па ільнавалакне—на 113 проц. Калгасьнікі «Новага быту» ўзялі на грамадзкі буксір калгасы Бярэзоўскага сельсавету.

***

РАГАЧОЎ. Калгасы раёну дзейнасьці Рагачоўскай МТС павінны былі здаць дзяржаве 300 тон збожжа. Вакол збожжазагатовак партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі МТС разгарнулі шырокую масавую работу. На 20 сьнежня калгасы перавыканалі ўжо заданьне і здалі 335 тон. Зараз калгасы ўсе сілы пераключылі на завяршэньне апрацоўкі ільну і здачу дзяржаве ільнавалакна.

***

КАПЫЛЬ. (Наш кар.).

Калгас «ШТУРМАВЕЦ», Ланцуцкага сельсавету, выканаў плян збожжазагатовак на 100 проц. і высунуў сустрэчны плян. Брыгада з перадавых калгасьнікаў выехала ў суседні калгас «ШЛЯХ КАМУНЫ» і ўзяла яго на грамадзкі буксір. Абодва калгасы выканалі свае сустрэчныя пляны. У масавай рабоце вакол збожжазагатовак у гэтых калгасах прымала актыўны ўдзел настаўніцтва і вучні.

***

БАРЫСАЎ. Калгас «ПЕРАДАВІК», Хаўхоніцкага сельсавету, упяроды ў абвешчаны «Праўдой» конкурс за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. У адзнаку конкурсу калгас поўнасьцю выканаў усе заданьні па загатоўках.

***

ВЕТКА. (Белта).

Калгасы Тарасаўскага, В.-Нямкоўскага, Калінінскага і К.-Балсунскага сельсаветаў пасьпяхова скончылі здачу збожжа, значна перавыканаўшы плян.

Тарасаўскі сельсавет выканаў заданьне на 338 проц. Вянжкаўскі—на 206 проц. і Калінінскі—на 107 проц. Гэтыя посьпехі зьявіліся вынікам шырока разгорнутай масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай часткі сялянства, вынікам рашучай барацьбы з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі.

МТС БССР перавыканалі гадавы плян здачы збожжа

Машына-трактарныя станцыі БССР дабіліся вялікай перамогі на збожжазагатоўчым фронце. На 1-га студзеня МТС выканалі гадавы плян здачы збожжа на 117 проц.

Перадавыя МТС — Церахаўская, Заслаўская, Танеская, Лепельская і інш. — выканалі і перавыканалі свае заданьні датэрмінова.



У ДЗЕНЬ УДАРНІКА—ПРЫВІТАНЬНЕ ЭНТУЗІЯСТАМ ПЯЦІГОДКІ!

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—ДА НОВЫХ БАЁЎ, НОВЫХ ПЕРАМОГ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ НА АСНОВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ 6 УМОЎ тав. СТАЛІНА

Д. Чудноўскі

Плян далейшай індустрыялізацыі БССР

1931 год—рашаючы год пяцігодкі. Гэтым годам сусьветна-гістарычных перамог сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя перамогі кавалваны ў жорсткай і непрымірымай барацьбе супроць правага і «левага» апартунізму, за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Па працягу першай пяцігодкі адбыўся каронны крух ва ўсёй сацыяльна-эканамічнай структуры БССР. Даволі сказаць, што ў 1931 г. удзельная вага прамысловасьці ў народнай гаспадарцы краіны складала да 50 проц.

Павялічылася ўдзельная вага пралетарыяту. Калі да пачатку пяцігодкі лік рабочых раўняўся 1,42 проц. усяго насельніцтва, дык ў 1931 годзе гэты процант павышаецца да 2,92.

Значна перакрыты намечаныя пяцігадовага плану па асноўных паказальніках работы сацыялістычнай прамысловасьці.

Гэтыя посьпехі асабліва паказальныя на фоне жорсткага эканамічнага крызису, які ахрасае ўвесь капіталістычны сьвет, на фоне няўхільнага росту беспрацоўя ва ўсіх краінах капіталістычнай Эўропы і Амэрыкі.

Пяцігадовы плян прадугледжваў капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць у 1932-33 годзе ў разьмеры 77.119 тыс., а за пяць год—у 312.555 тыс. руб. Кантрольныя лічбы 1932 году намечаюць разьмер капітальных укладаньняў у 205.252 тыс. руб., за чатыры гады ўкладзена ў прамысловасьць 404 432 тыс. Лік рабочых паводле пяцігадовага плану ў 1932-33 г. павінен быў складаць 93.700 чал.; кантрольныя лічбы 1932 году прадугледжваюць павялічэньне колькасьці рабочых да 102.369 чал.

Валавая прадукцыя сацыялістычнай прамысловасьці, паводле пяцігадовага плану, у 1932-33 г. г. павінна была дасягнуць 981.574 тыс. руб. Кантрольныя-ж лічбы 1932 г. прадугледжваюць рост прадукцыі да 1.417.721.000 руб. За чатыры гады абём вытворчасьці перавысіў 3 мілярда руб.

Для таго, каб пераканаць аб вялізарным гістарычным значэньні гэтых вынікаў, трэба параўнаць узровень, якога дасягнула прамысловасьць БССР да канца першай пяцігодкі, з узроўнем першых год работы.

Валавая прадукцыя, якая ў 1932 г. складае 1,4 мілярда руб., у 1922-23 году раўнялася толь 20 млн., гэта зн. што за 10 год сацыялістычнага будаўніцтва прадукцыя прамысловасьці ўзрастае ў 70 раз. Колькасьць рабочых, якая ў 1922-23 г. г. складала 1,7 тыс. чалавек, да 1930 г. узрастае да 102 тыс., г. зн. павялічваецца ў 61 раз.

Да пачатку першай пяцігодкі асноўныя фонды прамысловасьці раўняліся 68 млн. руб., на працягу першага пяцігодзьдзя ўкладаньні ў прамысловасьць узрастуць да 404 млн. руб.—у 6 раз павялічваецца матар'яльна-тэхнічная база нашай прамысловасьці.

Вялізарныя посьпехі індустрыялізацыі краіны стварылі ўсе прадпасылкі для перамог і на фронце калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Якія задачы стаяць перад прамысловасьцю БССР у 1932 г.? Што трэба зрабіць, каб забясьпечыць далейшае ўзмацненьне кіруючай ролі прамысловасьці ў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі БССР?

1932 год уключае ў сябе ўсе элементы, неабходныя для пераможнага скончэньня першай пяцігодкі за чатыры гады, у той-жа час закладвае фундамант для выкананьня пляну 2-ой пяцігодкі.

Галавая задача чацьвертага, заключнага году—максымальная канцэнтрацыя ўвагі, сродкаў і сіл на асноўных вузлавых участках прамысловасьці, яе спэцыялізацыя, што забясьпечвае як найхутчэйшыя тэмпы разьвіцьця вытворчых сіл краіны, так і выпачэньне настаянага месца БССР у прамысловай вытворчасьці Усяго Саюзу.

Гэтай мэтаімклівай канцэнтраванасьцю прасякнуты ўсе элементы народна-гаспадарчага пляну 1932 г.

Капітальныя ўкладаньні, накіраваныя на асноўныя вузлавыя участкі (торф—9 проц. усіх укладаньняў, будматар'ялы і будаўнічая індустрыя—12,2 проц., дрэвазапрацоўчая прамысловасьць і лясная гаспадарка—13,6 проц., хімічная прамысловасьць — 5,6 проц., мэталяапрацоўчая 8,9 проц.) забясьпечваюць, як павышэньне матар'яльна-тэхнічнай базы так і значную актывізацыю асноўных укладаньняў мінулых год (пуск Крычаўскага цэмэнтнага заводу, Гомельскай гуты, азотнага, серка-вугляроднага заводаў, асваеньне Аршанскага ільнакамбінату, будаўніцтва мясного камбінату, валу дрэвазапрацоўчых, капфоля - экстрактнага заводу і інш.). Асваеньне новага прамысловага будаўніцтва ў канцы 1931 году і ў пачатку 1932 году дае ў чацьвертым, заключным такі рост прамысловай вытворчасьці, які перакрывае ўзровень апошняга году пяцігодкі, і забясьпечвае выкананьне пяцігадовага пляну за чатыры гады.

Найбольш інтэнсыўны рост прадукцыі вызначан па асноўных галінах. Прадукцыя тарфянай прамысловасьці павялічваецца на 250 проц. у параўнаньні са здабычай 1931 г. Здабыча 2 млн. тон торфу зьвяцца асновай запраектаваньня ўдзельнай вагі тарфянага апалу ў агульным балансе ў 44% (на прамыслова-тэхнічнай групе). Выкананьне такой праграмы магчыма толькі на базе перабудовы работы торфазаводаў, узмацненьня апэрацыйнага тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, значнага ўзмацненьня мэханізацыі здабычы і транспарту. На аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, тарфяная прамысловасьць цалкам выйдзе рашучага пералому ў сваёй работе.

Значны рост (213 проц.) у 1932 г. дае хімічная прамысловасьць, якая асвойвае рад новых прадпрыемстваў (азотнавы, серка-вугляродны і інш. заводы). Фасфарытная прамысловасьць дасьць сельскай гаспадарцы БССР 34 тыс. тон фасфарытнай мукі.

Будаўнічая вытворчасьць, прадукцыя якой пакінна ўзрасьці на 284 проц., дасьць у 1932 г. 23,4 проц. новых відаў будаўнічых матар'ялаў. Рэалізацыя гэтай вытворчай праграмы магчыма толькі пры ўмове ліквідацыі таго насьпішага супраціўленьня, якое сустракае ўжываньне новых будаўнічых матар'ялаў з боку раду гаспадарчых арганізацый.

Значна ўзрастаюць і іншыя галіны прамысловасьці: мэталяапрацоўчая, дрэвазапрацоўчая і інш.

Рост матар'яльнага дабрабыту працоўных мас, на аснове посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, высоўвае задачу карэннай рэканструкцыі харчовай прамысловасьці, у першую чаргу задачу стварэньня мясной і кансэрвовай індустрыі. Плян капітальных работ на 1932 г. прадугледжвае ўкладаньне звыш 25 млн. руб. у разьвіцьцё харчовай прамысловасьці, пабудову больш 20 прамысловых аб'ектаў.

1932 год павінен прайсьці пад знакам рашучай барацьбы за выкананьне якасных паказальнікаў, якія адстаюць у нас як ад планавых праектаваньняў, так і ад замежных паказальнікаў па СССР, якія зьмяжаюць на працягу мінулых год, у тым ліку і 1931 год у вялізарны станоўчы эфэкт работы прамысловасьці.

Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі дагэтуль не выканана. У 1928-29 г. г. сабекошт зьніжан на 4,9 проц. замест 6,4 паводле пляну, у 1929-30 г.г. — на 7,8 проц. замест 11,5 проц., у 1931 г. у разьмеры каля 1,4 проц. замест 7,8 проц.

Якасьць прадукцыі—на нездавальняючым узроўні. Мала ўвагі аддана павышэньню ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці.

Асноўныя прычыны адставаньня якасных паказальнікаў—гэта новыстарчальная рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна, слабая ўвага пытаньню мавсымальнага эфэктыўнага выкарыстаньня існуючых на прадпрыемствах магчымасьцяй (скарыстаньне захаваных рэзэрваў, абсталяваньня, рабсілы і інш).

1932 год для прамысловасьці БССР зьяўляецца рашаючым годам асваеньня якасных паказальнікаў работы прамысловасьці.

У цэнтры работы прамысловасьці БССР трэба паставіць задачу—зьніжэньня сабекошту прадукцыі рэспубліканскай прамысловасьці на 8,1 проц. Народна-гаспадарчы плян дае ўсе магчымасьці для рэалізацыі гэтага заданьня. Плян зьніжэньня сабекошту прадугледжвае ажыцьцяўленьне гэтай адказнай задачы на 58,5 проц. за лік рацыяналізацыі, па асноўнай групе прадпрыемстваў гэты процант павышаецца да 64,2. Гэта абавязвае ўсю шырокую партыйную і пралетарскую грамадзкасьць дабіцца, каб рацыяналізацыя і рэалізацыя рабочых прапаноў сталі асноўнымі крыніцамі зьніжэньня сабекошту прадукцыі.

Максымальнае выкарыстаньне абсталяваньня, зьніжэньне ўдзельных норм расходаваньня сырцу і апалу, барацьба са стратамі і бракам, рост прадукцыйнасьці (на прамысловасьці ВСНГ—на 26,1 проц.) працы, правядзеньне станкартызацыі, шырокая мэханізацыя работ—вось вялізарныя рэсурсы сацыялістычных накапленьняў у прамысловасьці, вось зарука выкананьня якасных паказальнікаў.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, змагаючыся з правымі і «левымі» апартуністамі і прымяняючы на аснове вялікага ўзьйому сацыяналістычнага і ўдарніцтва і рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна, якія забясьпечваюць перамогу, рабочая клясa БССР забяцае ў 1932 г. поўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

А. Манькоў

ПЯЦЬДЗЕСЯТ...

Першае паўгодзьдзе прынесла ганебныя розультаты. Брыгада Мірскага завіхвалася краіне 75 гравісартовак. ПРЫЧЫНЫ: людзі валтарвалі з брыгады ў брыгаду, склад зьмяняўся, прагулы расьлі, ня было належнай расстаноўкі сіл.

Калі ўчора рабочы зьбіраў барабан, дык сёньня ён устанаўліў каретку. Брыгаду разьядала ўраўнілаўка. Паміж цяжкой і лёгкай, кваліфікаванай і некваліфікаванай працай ставіўся знак роўнасьці. Прыходзячы на завод, рабочы блукаў з цэху ў цэх, шукаючы інструмантаў. Іншаразла нават тралыцыя — «герояи» лічыўся той, хто напрыкметна цішком «ціснуў» інструмант у таварыша на рабоце.

Былі ў брыгадзе людзі, якія імкнуліся ацэ работу нагорш, а атрымаць за яе набольш. Той, хто хварэў за вытворчасьць, аддаваў свой вольны час на перарабоку бракаваных машын. Лепшыя ўдарнікі-энтузіясты на лічыліся з выходнымі днямі, каб толькі ліквідаваць адставаньне брыгады. Гэта не дапамагала. Ураўнілаўка ў зарплаце і абязьлічка надрывалі намаганьні ўдарнікаў. Брыгадзір Мірскі безпаможна разводзіў рукамі, ня ведаючы, што рабіць. Выхад знайшлі ўдарнікі. На сходзе брыгады яны на ўпор паставілі пытаньне:

— Брыгадзе — моцнае кіраўніцтва! Нездольных кіраўнікоў трэба зьняць!

— Наша кіраўніцтва ведае толькі аб тым, што мы адстаем, а шляхоў ліквідацыі не знаходзіць — сказаў на сходзе ўдарнік Філіповіч Франц... Цэхавы трыкутнік заставіў патрабаваньне сходу. На чале брыгады сталі новыя кіраўнікі.

Абноўлены брыгадны трыкутнік на чале з тав. Філіповічам распрацаваў

Тав. Собаль, ударнік Гомсельмашу; парторг брыгады абрубшчыкаў.

канкрэтную праграму рэалізацыі 6 умоў вераногі — 6 указаньняў правадыра партыі, тав. Сталіна. За праграмай сьледуе практычная работа. Рабочая сіла расстаўлена на варштатах, згодна кваліфікацыі. Кожны прымацаван да варштатаў і вучастку. Кожнаму выдан інструмант. Партыйная група на чале з парторгам Гацюкевічам шырока разгортвае канкрэтнае спаборніцтва па прафесіях. Група разьмеркае заклоне дагавор са сьвідравальшчыкамі на сваячасовую здачу тэталяў. Група зборкі барабанаў абязьвалецца не затрымліваць працэсу работы і падавадь сваячасова барабаны ўстаноўшчыкам каротак. Кляпальнічыкі спаборнічаюць са зборнічыкамі.

Інакш запрацавала брыгада...

Перабудавала сыстэма зарплаты. Уведзена неабмежаваная зьдольнічына. Брыгада Філіповіча першай верахоздзіць на прэміяльную прагрэсыўку.

На 118 проц. узьнялася прадукцыйнасьць працы. Заработак кожнага рабочага брыгады ў сярэднім павялічыўся ў параўнаньні з першым паўгодзьдзем на 33 руб.

У верасьні брыгада перайшла на гаспадарчы разрахунак. Разгарнулася мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў.

Гаспадарчы разрахунак, мыеннасустрочны плян, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі заладзілі для брыгады новыя і новыя вераногі.

Ажыцьцяўленьне 6 умоў дапамагло брыгадзе вывесьці лішкі рабочай сілы.

— Скарацілі лік рабочых на 5 чалавек. Брыгада высунула сустрэчны —павялічыць выпуск машын з 90 да 110.

Пьвёрдыні ўпэўненыя крокалі, пад кіраўніцтвам партгрупы і цэхавай партарганізацыі, ішла брыгада Філіповіча наперад. Яна перакрыла сустрэчны: замест 110 машын у месяц давала 114, 115 і нават 117.

***

Зноў перашкоды... Зноў неадпаведнае заводскага пляну. 60-ты нумар штодзенкі б'е трывогу.

Не хапае жалеза... Лепшыя магазыны за плян славяліся з кута ў кут вялікага мэханічнага цэху...

Так цягнулася нядоўга. Перабої ў дастаўцы жалеза, былі хутка ліквідаваны. Брыгада зноў узялася за работу. Ударнікі мабілізаваліся на ліквідацыю адставаньня, якое стварылася з-за недахвату сырцу.

Брыгада гравісартовак узялася дамагчы фальцоўчыкам цэхавага цэху. Шляхам перадачы іх вопыту сваёй работы яна дабілася штодзённай падачы 15 сэктароў замест 10.

Брыгада дапамагла ліквідаваць перабої і ў іншых групах.

Яна добра выканала ролю «сквозной» буксірнай.

22 сьнежня ў 3 гадзіны 15 гвілін выпушчана апошняя гравісартовка пляну 1931 г. Вытворчы энтузіязм перакіг...

29 лепшых ударнікаў, пад кіраўніцтвам тав. Філіповіча, Гацюкевіча і Зубарава, даюць зараз краіне пяцьдзесят машын звыш пляну.

Ня піша больш прыёмшчык крэйдай на машынах «брак». Яго ў брыгадзе няма.

Усё часьцей зьяўляецца новая адзнака—«добра».

— Прагулаў і спазьненьняў у нас няма—з гонарам заўважае Філіповіч, пядаўна чорнарабочы, зараз кіраўнік гаспадарча-разрахунковай брыгады на зборцы гравісартовак.

Брыгада ўступае ў чацьверты, заключны год пяцігодкі. Яна дала сабе імя—«брыгада XIV зьезду КП(б)Б.» Яна ўзяла на сябе цьвёрдае абавязацельства і абвяшчае зьезду—у чацьвертым годзе датэрмінова выканаць і амфіпляны па ўсіх паказальніках.

Завод імя Варашылава, 30 сьнежня.

ЛЕПШАЯ УДАРНІЦА дрэвазапрацоўчага цэху зав. „Полымя рэвалюцыі" тав. ХМЫС

ЗРК „Мэталіст"--узорны цэх снабжэньня

Машына-будаўнічыя заводы «Калужар», імя Варашылава—найбольшыя мэталюргічныя прадпрыемствы БССР. Рабочыя гэтых заводаў не адзін раз паказалі ўзоры барацьбы за прамфінплян, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

У перамогах кажуцца ўдачу і варашылаўцы значныя заслугі мае ЗРК «Мэталіст», які вяртаварыўся ў сацраўды ўзорны цэх снабжэньня.

Разгортваньне савецкага гандлю, рэгуляцыя самазагатовак і падсобных прадпрыемстваў (сьмітаранка), аклад бюджэту рабочага, барацьба за якасьць снабжэньня і грамадзкага харчаваньня—такая галавая праграма ЗРК «Мэталіст».

ЗРК «Мэталіст»—складая калаборацыйная арганізацыя, ён быў створаны у сакавіку 1931 году. Пры актыўным удзельнічаньні і ўсямерай дапамозе з боку заводскай грамадзкасьці калаборатыў акалаўся адольным перабудаваць на-хаду, пераключыцца на рэйкі разгортваньня савецкага гандлю і паляпшэньня снабжэньня рабочых.

У чым заключаецца гэта перабудова і якія вынікі?

Пры вылучэньні з МЦРК калаборатыў неў усяго 2 магазыны, цяпер іх 7. Таварааборот павялічыўся з 315 тыс. руб. у другім квартале да 606 тыс. руб. у чацьвертым квартале, або амаль на 50 проц. Заборот тавараў—5½ дзён пры ліміце ў 10 дзён.

Дэцэнтралізаваныя закупкі і паляпшаныя закупкі займаюць важнейшае месца ў таваразвароце. Яны сталі рэальнымі зьявамі у забясьпечэньні 4.000 рабочых і членаў іх сем'яў.

Самазагатоўкі рэтуць з кварталу ў квартал. Многія самастойныя закупкі прадуктаў і тавараў перавышаюць у значнай ступені колькасьць тавараў, якія паступіла на цэнтралізаваным пляне.

Прыхаваем лічбы. У 2-м квартале паступіла па плане гатовага адзеньня на 56.200 руб., закуплена паляпшаным нарадкам на 106.330 руб., гэлантарэі адпаведна—26.000 руб. і 87.000 руб. Абутку—10.100 руб. і 16.000 руб., і г. д. У 4-м квартале дэцэнтралізаваныя закупкі павялічэлі яшчэ больш размах.

Удзельная вага мясныманых закупак і загатовак да агульнага месячнага таваразвароту складае 86,2 проц. Бюджэт рабочага ацэнены на апэратывам на 78,3 проц.

Ударніку — пераважнае снабжэньне. Гэты прынцып добра ўсвоены работнікамі калаборатыву. З агульнай колькасьці тавараў—40 проц. вызначаюцца спэцыяльна для снабжэньня ўдарнікаў. За кароткі тэрмін ударнікі атрымалі 400 зімніх і летніх паліто, 350 пар штаноў, 400 пар балізны, 150 пар верхніх рубашак і г. д. Зімнія нормы выдаецца мяса, сала і інш. прадукты і прамтавары.

З 1-га студзеня арганізуецца дастаўка тавараў на дом у першую чаргу ўдарнікам.

Укараненьне гаспадарчага разрахунку і вызьдзельчыны дало значны крух на ўсёй рабоце гандлёвай сеткі. Кожны магазын мае самастойны балянс. Прадукцыйнасьць працы работнікаў прылаўку значна павялічылася.

Міх. Юн.

ІНТЭРВЭНЦЫЯ СУПРОЦЬ МАНЧЖУРЫІ І ПАДРЫХТОЎКА ВЯЛІКАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ*)

XI пленум ВККІ канстатаваў, што небясьпека ваеннай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу ў сувязі з пераламаючым у іх сацыялізмам і з абвастраньнем эканамічнага крызису ў капіталістычных краінах стала непасрэдна небясьпекай для ўсяго сусьветнага пралетарыяту.

Многія сакрэты Камінтэрну пакавалі ацэнілі ўсю рэальнасьць гэтай небясьпекі. Нават тады, калі японскія гарматы загрымелі непасрэдна ў суседзтве з Савецкім Саюзам, многія таварышы не зразумелі цесный сувязі паміж японскім паходам на Манчжурыю і падрыхтоўкай вялікай антысавецкай вайны.

Гэта абавязвае нас яшчэ і яшчэ раз канцэнтраваць увагу ўсіх камунараў і ўсяго кіруючага пралетарыяту на гэтым надзвычай пытаньні.

***

Як скончылася грамадзянская вайна ў СССР, калі ўведзен быў НЭП, міжнародная буржуазія, не пакідаючы мысьлі аб інтэрвэнцыі, не сьпяшалася, адкак, з гэтым, разлічваючы на мірнае перарожаньне савецкай улады. Калі-ж гэта мазэя рухнула, імпэрыялістычныя дзяржавы ўзялі проваты курс на інтэрвэнцыю і на актывізацыю ідэяй ня контр-рэвалюцыйных сіл унутры Савецкага Саюзу.

Працэсы «Прампартыі», кандрацьдэўскай кулацкай групы, саюзнага бюро меншавікоў і рад іншых фактаў сьведчылі аб імкненьні імпэрыялістычных дзяржаў, у першую чаргу Францыі, разбурыць сацыялістычнае будаўніцтва з сярэдзіны, арганізаваць шкодніцтва і паўстаньні ў Савецкім Саюзе і ажыцьцявіць перадачу невялікімі сіламі суседніх краін, якія фінансуюцца, забясьпечваюцца і кіруюцца буйнымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, і перш за ўсё Францыяй, інтэрвэнцыю.

Посьпехі гаспадарчага будаўніцтва СССР, забясьпечаўшыя з пункту погляду суадносін унутраных сіл перамогу сацыялізму ў нашай краіне, разгром шкодніцкіх арганізацый, рост рэвалюцыйнай актыўнасьці мас у капіталістычных краінах і калёніях, рабілі ажыцьцяўленьне гэтага пляну немагчымым. Імпэрыялісты былі вынушаны зразумець, што магчымасьць росту капіталізму ў СССР пры дапамозе ўнутраных контр-рэвалюцыйных сіл і інтэрвэнцыі рашэйшага маштабу выключана. Яны вынушаны былі адтэрміновать інтэрвэнцыю, якая меркавалася на 1930-31 год, і пачаць усебаковую падрыхтоўку інтэрвэнцыі на больш шырокай базе.

Паглыбленьне сусьветнага эканамічнага крызису і пагроза фінансавага краху ў радзе краін, ня гледзячы на выкліканае гэтым абвастрэньне імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, паскараюць працэс падрыхтоўкі вялікай антысавецкай вайны супроць краіны, у якой будуецца сацыялізм, капіталістычныя дзяржавы стараліся зрабіць пад дымавой заслонай панфібізму.

Францыя, падрыхтоўваючы гэту вайну, пачала перагаворы з Савецкім Саюзам аб заключэньні дагавору аб ненападзе і адмавіла ганлёвым перагаворы. Гэта патрэбна было французскаму імпэрыялізму для таго, каб ад шырокіх мас утаіць факт арганізацыі антысавецкай вайны па больш шырокай основе.

Гэту шырокую інтэрвэнцыю Францыя не магла падрыхтаваць адна, яна не магла таксама кіраваць вынішчым антысавецкім фронтам, як яна кіравала дзеяньнямі пагранічных дзяржаў у барацьбе супроць СССР.

Для французскага імпэрыялізму было нарэшце лёгка стварыць вяроже кольца вакол Савецкага Саюзу з васальных дзяржаў — Польшчы, Румыніі і г. д. Гэтыя краіны па французскай ініцыятыве заключылі ваенны саюз. Яны, дзякуючы французкім пазыкам, маглі шалёным тэмпам узброіцца, будаваць на савецкай граніцы стратэгічныя чыгункі, ваенныя парты.

Антысавецкую мэту ўзбраеньняў гэтыя дзяржавы зусім адкрыта прызнавалі. Яны адкрыта вымагалі, што ня толькі ня могуць разброіцца, але лічаць свае ваенныя сілы невыстарчальнымі, бо ў іх суседзтве знаходзіцца Савецкі Саюз (румынскі мэмарандум Лізе нацый). Па французкай ініцыятыве пастаўлены былі пад агульнае камандаваньне Пілсудзкага польскія і румынскія арміі, скліканы былі нарады генэральных штабаў пагранічных з СССР краін. Францыя стварыла ваенны арэнал будучай антысавецкай вайны ў Чэха-Славакіі.

Задача пашырэньня антысавецкага фронту ставіла перад Францыяй больш цяжкую праблему: ўцягнуць у сваю імпэрыялістычную групоўку пераможаныя эўрапэйскія дзяржавы, прычым Францыя хацела дасягнуць сваёй мэты, захоўваючы ў поўнай меры вэрсальскі грабежніцкі мір, сан-жэрмэнскі і трыанонскі мірныя дагаворы.

Да ўцягненьня пераможаных дзяржаў у сваю антысавецкую імпэрыялістычную групоўку плянамерна імкнула французкі імпэрыялізм, выкарыстоўваючы цяжкае эканамічнае і фінансавае становішча Германіі, Аўстрыі і Венгрыі. Лаваль і Брыян падзічай умела выкарысталі фінансавыя затрудненьні гэтых краін.

У адказ на спробы стварэньня аўстра-германскага мытнага саюзу Францыя выклікала крах венскага банку «Крэдытанштальт», які кантралюе 80 проц. аўстрыйскай прамысловасьці, і прымусіла Аўстрыю адмовіцца ад гэтага саюзу. Для вызначэньня Германіі французкі імпэрыялізм выкарыстоўвае абавязацельствы апошняй па рэпарацыйных плацяжох і патрэбнасьць у замежных пазыках. Фінансавая добра ведае, што Германія ніадольна плаціць рэпарацыі ў разьмерах, устаноўленых плянам Юнга, што пазыку пры цяперашніх умовах грашовага рынку Германія можа атрымаць толькі з Парыжу.

Гэта становішча Францыя выкарыстоўвае цалкам. Яна патрабуе поўнага эканамічнага і палітычнага падпарадкаваньня Германіі, кантролю над яе дзяржкай, у першую чаргу ваеннай прамысловасьцю. Чаго ня мог дасягнуць французкі фінансавы капітал у свой час акупацыяй Рурскай вобласьці, тое ён цяпер хоча ажыцьцявіць пры дапамозе сваёй фінансавай магутнасьці.

Гэтым шляхам, аб якім, між іншым, сьведчыць згода на прадэтэрміненьне пазыкі толькі пры ўмове адмаўленьня ад крэдытаваньня савецкага імпарту, хочуць кіруючыя фінансавыя колы Францыі стварыць магчымасьць для ўцягненьня Германіі ў антысавецкі блёк. Некаторыя колы для паскарэньня працэсу ўцягненьня Германіі ў інтэрвэнцкі фронт гатовы ісьці нават на збліжэньне з гітлераўцамі, а тым, са свайго боку, для паскарэньня фашызацыі Германіі гатовы прадаць апошнія рэшткі яе нацыянальнай незалежнасьці, барацьбу за якую яны змагаючыся выставілі на сваім сьцягу.

Ва Усходняй Эўропе французкі імпэрыялізм таксама імкнецца да пашырэньня свайго ўплыву шляхам стварэньня цеснага супрацоўніцтва паміж пераможанымі прыгнанайскімі краінамі і вадасальнымі імкнімі Малой Антанты. Але, імкнучыся над сваім кіраўніцтвам стварыць адзіны антысавецкі блёк на эўрапэйскім кантынэнце, Францыя ня хоча і ня можа адмовіцца ад захаваньня сыстэмы вэрсальскага міру, якая зьяўляецца асновай яе магутнасьці і сілы. Гэта-ж акалічнасьць, хаця і палягчае Францыі заваяваньне новых пазыцый, але ў той-жа час затрудняе дасягненьне яе мэт, устанаўленьне яе бязумоўнай і поўнай эўрапэйскай гегемоніі.

Супярэчнасьці, створаныя ў Эўропе вэрсальскім мірам, выкарыстоўвае італьянскі і амэрыканскі імпэрыялізм у барацьбе супроць бязумоўнай гегемоніі Францыі. Італія з вясны гэтага году знаходзіцца ў адносінах да французкага імпэрыялізму ў абарончай пазыцыі. Яна страціла ў Венгрыі значную частку свайго ўплыву, у Вене таксама ўмацавалася за яе кошт Францыя. Італія цяпер баіцца, што наладжаньне цесных сувязяй паміж Парыжам і Бэрлінам загоніць яе ў поўную ізаляцыю.

Калі ўдасца французскаму імпэрыялізму забясьпечыць сабе ў Германіі цьвёрдыя пазыцыі, то Італіі таксама патрэбна будзе шукаць міласьці парыскіх кіраўнікоў. Гэта не азначала-б нічога іншага, як адмаўленьне ад Тунісу, ад малаазіяцкіх патрабаваньняў, ад балканскага ўплыву, г. зн. страту становішча вялікай дзяржавы.

Таму Італія імкнецца перашкодзіць ажыцьцяўленьню ўсеэўрапэйскай французкай гегемоніі. Таму пасьля аслабленьня Англіі Італія арыентуецца цяпер на Амэрыку, інтарэсы якое на істотных пытаньнях разыходзяцца з інтарэсамі Францыі. Гэта высьветлілася і ў часе дыскусіі вакол пляну Гувэра і пры спатканьні Лаваля і Гувэра ў Вашынгтоне. Па важнейшых пытаньнях міжнародай палітыкі, на пытаньнях вэрсальскага і трыанонскага дагаворў, у пытаньні аб разабраньні ня было дасягнута ніякай згоды.

Амэрыка, не выступаючы супроць вэрсальскай сыстэмы, наколькі Францыя зьяўляецца не лепшым саюзьнікам у вайне, якая падрыхтоўваецца супроць СССР, усё-ж імкнецца ўмацаваць свой уплыў у пераможаных краінах, што магчыма толькі за кошт пазыцый Францыі.

Выявіліся ў Вашынгтоне істотныя супярэчнасьці і ў пытаньні аб рэпарацыях і міжсаюзьніцкіх пазтах. Яшчэ больш узмацнілася гэтыя супярэчнасьці ў выніку французкіх імкненьняў да ўстаноўленьня кантролю над германскай прамысловасьцю, у якую Амэрыка ўклала значны капітал.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі яшчэ больш абвастрыліся ў самы сённяшні час, пасьля перамогі ангельскіх кансэрватараў, дзякуючы ажыцьцяўленьню пратэкцыянізму ў Англіі, які стварае затрудненьні для экспарту розных краін. Уладзеньне пратэкцыянізму ўжо прыняло ў некаторых эўрапэйскіх дзяржавах да павышэньня мыт, да абмежаваньня імпарту і разам з тым да ўзмоцненай барацьбы за рынкі збыту.

Але абвастрэньне ўсіх гэтых супярэчнасьцяй нікольні не зьмякчыла і не зьмяншае шалёнай кампаніі імпэрыялістычных прапаведнікаў супроць СССР. Капіталістычныя краіны стараюцца выйсьці з крызису за кошт Савецкага Саюзу. У падрыхтоўцы вялікай вайны супроць Савецкага Саюзу, у пашырэньні антысавецкага фронту ўсё больш актыўны ўдзел прымае побач з Францыяй і Амэрыка.

Злучаныя штаты таксама зразумелі, што посьпехі пяцігодкі, узмацненьне ўдзелу рэвалюцыйнага руху ў капіталістычных і калёніяльных краінах ставяць пытаньне аб інтэрвэнцыі па-новаму. Гэта выклікала рэзкае абвастрэньне варожасьці ПАЗШ у адносінах да Савецкага Саюзу, што [illegible] яркае выяўленьне ў арганізацыі камісіі Фіша, якая пачала начатак барацьбе супроць так званага «Савецкага дэмпінгу».

Паглыбленьне і абвастрэньне крызису ў капіталістычных краінах, перамоцнае будаўніцтва сацыялізму ў Савецкім Саюзе прымушаюць імпэрыялістычныя дзяржавы, нягледзячы на супярэчнасьцям, прабаваць згуртаваць у адно цэлае супроць новага сьвету, які будуецца, усе сілы старога. На гэта ўказвае, адрача актывізацыі Амэрыкі, і новая актывізацыя антысавецкай дзейнасьці Лігі нацый.

Варожая СССР установка Лігі нацый яркa выявілася ў работе эканамічнага камісіі, дзе вострае разгалоссе паміж прадстаўнікамі імпэрыялістычных дзяржаў кожны раз прымірэлася, калі справа даходзіла да прыняцьця пастановы, накіраванай супроць інтарэсаў Савецкага Саюзу. Ліга нацый адыгрывае немалую ролю ў падрыхтоўцы эканамічнай і крэдытнай блёкады, у выпрацоўцы мерапрыемстваў супроць савецкага экспарту, у маскаваньні стварэньня шырокага антысавецкага фронту капіталістычных краін. Гэта падрыхтоўка вялікай вайны супроць Савецкага Саюзу ўвайшла ў новую, больш пострую фазу з моманту ваеннай інтэрвэнцыі Японіі супроць Манчжурыі.

***

Ужо тады, калі імпэрыялісты падрыхтоўвалі «жалую вайну» супроць Савецкага Саюзу па шэрэбіна-заходніх граніцах, яны адначасова прабавалі яго прамацаць штылюм з Усходу. Захват КУЧ у 1929 г. кітайскімі генэраламі ажыцьцёўлен быў па ўказцы імпэрыялістаў, якія разьлічалі шляхам гэтай правакацыі ўцягнуць Савецкі Саюз у вайну. Гэта спроба сарвалася, дзякуючы таму, што Чырвоная армія спасела выпінчаным удар захватчыкам і што савецкая ўлада ў той-ж час, ведучы пасіляўную і цьвёрдую палітыку міру, подкладала пасьля [illegible]

*) Пераданы крытыкуп, які зьмяшчаецца ў часопісі «Камуністычны Інтэрнацыянал».

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ТРАЦКІСЦКІХ КАНТРАБАНДЫСТАХ, ПА АПАРТУ НІЗЬМЕ І ШАВІНІЗЬМЕ. СУПРОЦЬ ГНІЛОГА ЛІБЭРАЛІЗМУ, ЗА ЛЕНІНІЗМ У ТЭОРЫІ І НА ПРАКТЫЦЫ!

ШЧЫЛЬНЕЙ ЗГУРТУЕМ РАДЫ ВАКОЛ ЦК КП(б)Б, ЦК УсеКП(б) І ПРАВАДЫРА ПАРТЫІ—ТАВ. СТАЛІНА

Новаму папаўненьню КП(б)Б— марксыцка-ленінскае выхаваньне

Мы ўступаем у чацьверты год пяцігодкі, год завяршэньня пляну вялікіх работ. Пройдзены этап быў этапам сусьветна-гістарычных пераломаў сацыялізму. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна наша краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна наша краіна з посьпехам завяршыла набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна наша краіна выканае пяцігодку за чатыры гады.

Гэтыя перамогі ня прышлі да нас самадёкам. Яны заваяваны ў пасьпяховай і непрымірымай барацьбе супроць правага і «левага» апартунізму, і прыхаваньцтва, за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Посьпехі сацыялістычнай будоўлі выклікаюць далейшы гіганцкі рост творчага энтузіязму і актыўнасьці рабочай класы і кільённых калгасных мас. Як ніколі вырасла і ўмацавалася давер'е найшырэйшых мас пралетарыяту і ўсіх працоўных да бальшавіцкай партыі і яе ленінскага кіраўніцтва. Непахісны аўтарытэт партыі ў рабочай класе, у масах працоўнага селянства. Адным з лепшых паказьнікаў гэтага бязмежнага давер'я пралетарыяту і працоўных мас да партыі бальшавікоў зьяўляецца вялізарная цага ў яе рады. Перадавыя пралетары, ударнікі сацыялістычнага спаборніцтва, праверэныя ў баёх за вялікую, калгаснікі загартаваныя ў клясавай барацьбе супроць кулака, шанаўнаюць рады УсеКП(б) і яе вернага атраду—КП(б)Б. У складзе партыі бязупынна расьце ўдзельная вага пралетарыяту, што зьяўляецца важнейшым прынцыпам бальшавізму ва ўнутрыпартыйным будаўніцтве.

За першыя тры кварталы 1931 г. у рады КП(б)Б прынята 11.368 чал. (за адпаведны пэрыяд 1930 г. у КП(б)Б было прынята 9.790 чал.). Сярод прынятых у партыю ў 1931 г. —5.220 прамысловых рабочых і 712 сельска-гаспадарчых, што складае 50,4 проц. да агульнага прыёму. На 1 кастрычніка 1931 г. у складзе КП(б)Б налічваецца 65,5 проц. рабочых па сацыяльным становішчы, 40,6 проц. членаў і кандыдатаў КП(б)—рабочыя ад варштату, якія непасрэдна працуюць на вытворчасьці.

Рост КП(б)Б праходзіў, грунтуючыся на барацьбе за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, у цесным сувязі з работай заводаў і фабрык, саўгасаў і калгасаў, дзе працуюць партыйныя ячэйкі. Інакш і быць ня можа. Адрыў работы па вярбоўцы ў партыю ад канкрэтнай барацьбы за колькасныя і якасныя паказьнікі выкананьня вытворчых праграм, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляўся б па сутнасьці нічым іншым, як пагоняй за голай лічбай. А такія факты ў некаторых ячэйках маюць месца.

Супроць такіх імкненьняў партыя рашуча змагаецца, патрабуючы арганічнай увязкі росту сваіх радоў з усёй работай па выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуючы суровага рэгуляваньня сацыяльнага складу, сыстэматычнага павялічэньня ўдзельнай вагі рабочых з вытворчасьці ў сваіх радох.

Перад усімі зьвенямі партыі ва ўсёй вышэйшай стаіць задача марксыцка-ленінскага выхаваньня камуністаў і асабліва новага папаўненьня. Тэарэтычная вучоба ў спалучэньні са штодзённай практычнай работай павінна ісьці па лініі выхаваньня мас у духу рашучай непрымірымасьці да ўсякіх імкненьняў апартунізму сказіць генэральную лінію партыі, у духу ахо вы чыстаты марксыцка-ленінскай тэорыі, у духу строгай клясавай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Марксыцка-ленінская тэорыя, непарыўна злучаная з рэвалюцыйнай практыкай, дае «упэўненасьць, сілу арыентаваньня і разуменьня ўнутранай сувязі акружаючых падзей, бо яна і толькі яна можа дапамагчы практыцы, зразумець ня толькі тое, як і куды рухаюцца клясы ў сучасным, але і тое, як і куды павінны рушыцца яны ў бліжэйшым будучым» (Сталін).

Аўладаньне вышэйшай марксыцка-ленінскай тэорыі—важнейшая неабходная ўмова пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач партыі. Важнасьць гэтай задачы з усёй ясьнасьцю выцякае з ліста тав. Сталіна «Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму». Разгорнутая прапрацоўка гэтага ліста ў арганізацыях КП(б)Б суправоджаецца базьлітаснай барацьбой з канкрэтнымі носьбітамі трацкісцкай кантрабанды, якія імкнуцца фальсыфікаваць гісторыю бальшавізму, і гнілым лібэралізмам да ідэйна-тэгічна-варожых праяўленьняў на навуковым фронце і ў практычнай работе.

Бальшавіцкая згуртаванасьць радоў нашай партыі, барацьба за павышэньне тэарэтычнага ўзроўню камуністаў, высокая клясавая пільнасьць і непрымірымасьць да ўсякіх праяўленьняў апартунізму, да зброяносцаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, да гнілога лібэралізму—зарука пасьпяховага выкананьня народна-гаспадарчага пляну 1932 г., зарука далейшых перамог сацыялізму.

Я. І.

Лямцава-вяровачная фабрыка перавыканала прамфінплян

Лямцава-вяровачная фабрыка «Чырвоны Бастрычнік» (Менск) рапартуе другой менскай гарадзкой партыйнай канферэнцыі аб датэрміновым выкананьні прамфінпляну 3-га рэшаючага. Да 30-га сьнежня фабрыка выканала план выпуску валавой прадукцыі на 100,2 проц., заданьне па росьце прадукцыйнасьці працы — на 112,5 проц. Гэтыя дасягненьні здабыты, дзякуючы пяўхільнаму правядзеньню ў жыцьцё 6 умоў тав. Сталіна і перабудове партыйнай, гаспадарчай і прафэсыянальнай работы.

Сакратар парткалектыву ПЕСІН.

Дырэктар фабрыкі МІЛЯУСКІ.

Старшыня заўкому КУЗЬМІЧ.

М. Гнілякевіч

ДА 13-Й ГАДАВІНЫ ЎТВАРЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР

13 ГОД НАЗАД—1-га студзеня 1919 году пастановай 1-га зьезду КП(б)Б і маніфестам Часовага рабоча-селянскага ўраду была абвешчана незалежнасьць Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі.

Прапоўныя БССР пры падтрымцы РСФСР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі, прыступілі да сацыялістычнага будаўніцтва ў мірных умовах. Але ў жніўні 1919 г. белапанская Польшча, выконваючы загад сусьветнай буржуазіі, а таксама ажыцьцяўляючы свае мары аб межах 1772 году, акупавала спачатку Менск, а потым і значную частку тэрыторыі Беларусі. Толькі 11 ліпеня 1920 году Беларуская ССР моцнымі і зьнішчальнымі ўдарамі Чырвонай арміі з дапамогай працоўных усіх савецкіх рэспублік была вызвалена ад акупацыі. Пачалася напру жаная сацыялістычная будоўля на ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Што атрымала ў спадчыну Беларуская ССР ад царскага ўраду, імпэрыялістычнай вайны, нямецкай і польскай акупацыі? Амаль цалкам зьнішчаную народную гаспадарку.

Раўнаць сучасны буйны росквіт нашай рэспублікі з тым яе становішчам, у якім яна была 13 год назад —гэта значыць раўнаць моцную, квіт нючую савецкую дзяржаву амаль з голымі сьцепамі. Прычынай такіх вялічэзных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва нашай рэспублікі зьяўляецца ленінскае кіраўніцтва камуністычнай партыі і правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, а таксама вялізарная брацкая дапамога Савецкага Саюзу.

Поўная роўнапраўнасьць усіх нацыянальнасьцяй, нацыянальныя школы, суды, газэты, літаратура, нацыянальныя саветы, лік якіх з кожным годам усё больш павялічваецца, і г. д. і г. д.—вось што мае БССР за 13 год свайго існаваньня, дзякуючы правільнаму вырашэньню нацыянальнага пытаньня. Усім нацыянальнасьцям БССР забясьпечана поўнае і пасьпяховае разьвіцьцё, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будаўніцтва сваёй культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесце.

Замест славутай «мяжы аседлась ці», савецкая ўлада выключную ўвагу зьвярнула на зямлеўпарадкаваньне працоўных яўрэеў, упарадкаваньне мястэчак, на палянізаваньне тым самым становішча працоўных яўрэяў.

Правільнае вырашэньне нацпытаньня таксама забясьпечыла і ўсе іншыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх яго галінах.

БССР атрымала ў спадчыну вруйнаваную, дробную, амаль выключна саматужную прамысловасьць, даходы ад якой складалі 17 проц. пры 22 проц. даходу ад прамысловасьці ў даваеннай Расіі. Пры гэтым у Беларусі фабрычна-заводзкая прамысловасьць давала толькі 28,4 проц. ўсёй прадукцыі, а ўся рэшта прадукцыі прыпадала на долю рамесьніцкай і саматужнай прамысловасьці.

Зараз БССР, якая цьвёрда стала на шлях індустрыялізацыі краіны, мае такія гіганты, як завод імя Варашылава, «Бальшавік», Бабруйскі дрованарпоўчы камбінат, Гомсельмаш, менскую і віцебскую швейныя фабрыкі, фабрыку штучнага валакна і г. д. На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў даваенны час налічвалася 20 тысяч рабочых. Цяпер-жа колькасьць рабочых па прамысловасьці на 1932 год запраектавана ў колькасьці 68 тысяч чал. Пасьпяховае выкананьне пляну першых трох год пяцігодкі дало магчымасьць яшчэ больш павялічыць вядучую ролю прамысловасьці, на капітальнае будаўніцтва, якое па лініі індустрыі будзе выдаткавана ў 1932 г. звыш 200 млн. руб.

Капіталаўкладаньні ў электрабудаўніцтва на 1932 г. запраектаваны ў сумі 29 млн. руб. Выраб электраэнэргіі ў 1932 г. павінен быць павялічан да 247 млн. кілёват-гадзін. Базай для разгортканьня электрыфікацыі БССР зьяўляюцца вялікія торфяныя багацьці. БССР за гэты час пабудавала Асінбуд, які дае электраэнэргію буйным фабрыкам і заводам Віцебску, Магілева, Ворпы. На базе шырокага разгортканьня сацыялістычнага будаўніцтва БССР, да гэтага часу цалкам ліквідавана беспрацоўе. Есьць буйныя посьпехі ў павышэньні культурнага і матар'яльнага ўзроўню працоўных мас. Зарплата з году ў год павялічваецца.

50 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў калгасы. На базе суцэльнай калектывізацыі лік відуецца апошняя цьвярдыня капіталізму кулацтва як класа. Сацыялістычная сельская гаспадарка дае больш паловы усёй с.-г. прадукцыі БССР. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі толькі за адзін 1931 год вырасла на 12,5 проц. Удзельная вага валавой прадукцыі сацыялістычнага сэктару за гэты-ж год павялічылася больш чым у два разы. У 1931 годзе арганізавана 1.064 МТКФ са ста ам буйной рагатай жывёлы ў 126.248 шт., з якіх 74.138 дойных; арганізавана 889 фэрм па гадоўлі цялят; 1.600 ТСФ, у якіх пастаўлена 71.000 сьвінаматак; 131 ПТКФ і 43 конягалоўчыя фэрмы. На 1932 год запраектавана 97 МТС, што дае магчымасьць менш ня менш адной МТС у кожным раёне.

Гэтыя посьпехі ў клясавай барацьбе, у барацьбе супроць правага ўхілу і «левацкіх» засьбёў, супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе і контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму і ўхілу ў бок да беларускага шавінізму і шавінізмаў усіх колераў.

Ня меншыя посьпехі Беларуская ССР мае ў галіне сацыяльна-культурнага будаўніцтва. Замест паркоўнапрыходзкіх школ і низначнай колькасьці сярэдніх, БССР мае Беларускую Акадэмію Навук, Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, Акадэмію сельскай і лясной гаспадаркі і дзесяткі іншых вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць новыя пралетарскія кадры. БССР першая з саюзных рэспублік увала ўсеагульнае навучаньне, якое ўжо ў 1931 годзе праводзілася на базе чатырохгодкі, а ў 1932 годзе будзе праводзіцца на базе сямігодкі.

Рабочая кляса БССР, пад правільным кіраўніцтвам камуністычнай партыі і з дапамогай Савецкага Саюзу, з посьпехам ажыцьцяўляе пяцігодку за чатыры гады.

В. ВОІНАЎ

ПАСЁЛКІ ТЫЯ-Ж, САЦЫЯЛЬНЫ ЗЬМЕСТ ІХ ІНШЫ

Пасёлкі — Мрочкі, Сітнікі, Лісці — ініцыятары арганізацыі калгасу «Будаўнік». 58 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, падпісаўшы статут с.-г. арцелі, паранылі па-новаму будаваць сваё жыцьцё.

Кулацкія пагрозы, папойкі, хлусьня —не затрымалі пасялкоўсіх сераднякоў, яны канчаткова павярнулі за калгасу. Кулака ў адкрытай бойцы пераламалі. Колькасны рост арцелі ў корані зьмяніў жаксны выгляд Мрочак, Сітнікаў, Лісцоў. Знаёмарку пасёлкі тыя-ж, але зьмест іх іншы.

Цяжкімі былі першыя кроўі новай будоўлі. Сямейка з 300 сялкоў — гэта ня простая сялянская сям'я. Кавалак зямлі ў 665 га—не серадняцкі надзел. 188 працаўнікоў трэба расставіць, кожнаму паказаць свае месца, дзе, што і як трэба рабіць. Вяржбыцкі Сьцяпан, першы актывіст пасялкоўскі, рукамі разводзіць, патыліцу чэша, прызнаецца ігнашэн «калектывізацыі гаспадаркі было куды лягчэй, чым іх арганізаваць на працы. Трэба, браточкі, вучыцца кіраваць буйнай гаспадаркай». Так было ў 1930 годзе.

І калгас «Будаўнік» навучыўся праз год. Даклад райкома старшынёй калгуніста Тарасевіча Алеся. Стварылі парт'ячэйку. Узяліся за працу па-новаму. Спэцыялізавалі калгас. Пабудавалі сьвінарник, якім з лепшых у Беларусі — на 104 станкі. Колькасьць сьвіней давялі да 102 штук. Па веснэ будзе больш — 200. Сьвінарнік кармляюць 5 чалавек. Адна калгасніца гатуе корм, астае навізаюцца калі сьвіней, 2 мужчыны чысьцяць станкі. Ачыстка станка адзначаецца ў 0.02 працадня, добры прогляд адзай галавы — 0.03, слабы — 0.02. Загатоўка корму для адзай сьвіньні — 0.02 працадня. Павялічыцца вага парасяці-сысуна на 1 кгр., ядаецца 0.02 працадня, павялічыцца вага кормнай сьвіньні на 1 кгр., затрачваецца 0.04 працадня і г. д. Зьвяльнічына зацікаўленае, калгаснікі клапочуцца аб сьвіньнях, днём і ноччу пільна сочаць за сьвінарнікам. І ўсё-ж такі адыход маладняка — 35 проц.

Буйная сьвінагадоўля ў калгасе — справа новая. Сьвінары і сьвінаркі пра ветэрынарнымі нічога ня ведаюць. курсаў не канчалі, карыстаюцца дамарошчанымі вопытам. Ветэлстары і ветфэльчары сюды не заглядаюць. Іх дзіві і цікавей сядзець у мястэчку. Дзеяньні ізаўкі не скарыстаць для «атакі» сьвіных хваробаў.

Арганізаваў калгас «Будаўнік» і малочную фэрму. Пярэчыў, бо не паваў сэпаратара. Праўленьне дабілася свайго. Малочная — дапамога сьвіной фэрме. Малочныя адыходы можна поўнасьцю скарыстаць для кармленьня парасят. Калгасам ужо пастаўлена 60 ройных кароў, гадуецца 21 шт. маладняка. За ўсёй рагатай жывёлай, якая расстаўлена ў трох пунктах, даглядаюць 6 жанчын. Яны-ж і даільшчыцы. Да кожнай прыкамандавана адпаведная колькасьць кароў. Удой 30-ці літроў малака адзначаецца ў 1 працадзень. З павялічэньнем удою будзе вымяшана распэйка норм.

Абязьлічка па дагляде коняй дзіва пачавала ў калгасе. Зараз яна выгнаецца, як самы непажаданы госьць. Вылучылі чатырох, найлепшых калгаснікаў — Лупэвіча Яся, Цітко Янку, Казлоўскага Лаўрона, Камароўскага Паўлюка — конюхамі. Замацавалі іх на гэтай рабоце на год. Да кожнага каня пазначана абруч, прымацаваны транспарт. Конюх гляжзіць за спраўнасьцю выданага і прынятага каня, эканомець, рэгулюе выдачу кармоў. Але шмат яшчэ трэба працаваць у гэтай галіне. Дзе-ні-дзе сустракаецца бесгаздзнасьць, не шануецца конь гультаём —аставным калгаснікам.

Кулак пераможан, але яшчэ засталіся элементы клясавай барацьбы ў калгасе. Разпаўзаньне спажывецкіх настрояў, агітацыя супроць зьдзельнічыны, спэцыялізацыі, за ўраўнаўку, зьніжэньне нормы выпрацоўкі — вось кулацкія мэтады ўкарвань з сярэдзіны калгасную вытворчасьць.

Адсюль — яшчэ больш клясавай пільнасьці в боку парт'ячэйкі. Больш мабілізаваньсці калгаснай масы па барацьбу з клясавым ворагам, за сацыялістычныя формы калгаснай працы.

Спэцыялізацыя гаспадаркі ў жывёлагалоўчым напрамку патрабуе цьвёрдай кармовай базы. Гэта добра зразумелі ў калгасе «Будаўнік», кожны ведаў, што лета корміць зіму.

Прапоўны калектыў калгасу «Будаўнік» пры ўборцы 225 га сенажаці заказаў прыкладны бальшавіцкай барацьбы за кармовую базу. Брыгада з 45 касноў, на чале з Рудзянскім Алесем, ня цёмна да цёмна працавала на сенажаці. Першымі ў прасоке ішлі Пратасевіч Ясь, Пратасевіч Алесь, Цітко Яшка. Не заставаў ад іх і 60-цігадовы дзед Лупэвіч. Капулі станавіліся салёнымі ад поту ў азістаўшых, але мускулы рук напружаюцца, бо гальба-ж быць выкінутым з прасоку.

— Ігнат, дай кагорку, ногі падрэку — крычаць зваду.

— Як, я ўдарнік ны табе буду кагорку даваць? — такія словы можна было чуць на сенажаці кожны дзень.

Успамінаючы пра клясавую, калгасьнік Жаўновіч Язэп казка: «Было мне 11 год, як памёр бацька. Я адзін з маткай пакутаваў на сваім каналачку балотца. Працаваў

ПАД ЗАСЛОНАЙ БАЛБАТНІ АБ РАЗБРАЕНЬНІ КАПІТАЛІСТЫ РЫХТУЮЦЬ НОВЫЯ ВОЙНЫ, НОВЫЯ ІНТЭРВЭНЦЫІ СУПРОЦЬ СССР

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА! УМАЦУЕМ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ! ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМІНТЭРНУ ПРАЛЕТАРЫЯТ УСЯГО СЬВЕТУ СТАНЕ НА АБАРОНУ СВАЕЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Польскі фашызм фабрыкуе крывавую пацыфікацыю супроць гераічных сялян Берасьцейшчыны

(З адозвы ЦК КПЗБ)

Рабочым, сяляне і салдаты!

Рабочая кляса ў Польшчы і на Зах. Беларусі вядзе рэвалюцыйную барацьбу з фашысцкай дыктатурай буржуазіі, змагаецца за вызваленьне ўсіх працоўных, эксплёатаваных і прыгнечаных. Кінуць забастовачная барацьба.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што недалёка ўжо тая хвіліна, калі рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, павядзе працоўныя масы на барацьбу за ўладу, за рабоча-сялянскі ўрад.

З сялянскіх мас Заходняй Беларусі ў першых радох супольнага, рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага фронту стануць сялянскія масы Берасьцейскай акругі. Рад паветаў Берасьцейскай акругі ўжо доўгі час вядуць упартую арганізаваную барацьбу супроць падатковага грабежніцтва, супроць шарваркавай паншчыны, супроць памешчыцкай і ліхварскай эксплёатацыі, супроць камасадыйнага грабежніцтва і рабунку сэрвітутаў, супроць пацыянальнага ўціску.

Працоўныя сяляне Берасьцейскай акругі сказалі: **«Ня будзем адрабляць шарваркаў, якія служаць акупантам для падрыхтаваньня ўзброенага нападу на СССР»** і, дзякуючы арганізаванай акцыі, пад кіраўніцтвам сялянскіх антышарваркавых камітэтаў, шарваркавай паншчыны не адрабляюць.

Але акупант таксама ня дрэмле. Пасьля карных экспэдыцый на пасаджаныя вёскі, у часе якіх масава зьнішчалі сялянскую маемасьць, катавалі мужчын, білі і зьневажалі жанчын і дзяцей, фашыцкі ўрад падрыхтоўвае вялікую пацыфікацыйную карную экспэдыцыю.

Трэба памятаць таксама, што фашысцкія «пацыфікацыі» і ваенна-палявыя суды маюць на мэце падрыхтаваньне тылу да вайны супроць СССР. Адначасова з падрыхтаваньнямі «пацыфікацыі» ў Берасьцейскім, зьявіўся ў Берасьці вядомы бандыт, «генерал» Балаховіч, які адкрыта мушструе свае банды і гаворыць прамовы, заклікаючы да вайны супроць СССР і да ягойскіх пагромаў.

Чытуначкі!

Варшатаўцы Вільні і Львова паказваюць вам шлях барацьбы. Вы, у вялізарнай большасьці польскія пралетары ў акупаванай імпэрыялістычнай польскай буржуазіяй Зах. Беларусі, пакажэце, што, як пралетары, вы супроць капіталістычнай палітыкі захвату і ўціску. Польскі пралетарыят павінен дапамагчы заваяваным народам скінуць ярмо акупацыі, каб самому вызваліцца ад ярма капіталу і фашызму. Вызваленчая барацьба польскага пралетарыяту зьяўляецца таксама барацьбой за вызваленьне падняволеных народаў, за іх права на самавызначэньне аж да аддзяленьня зд Польшчы. Дэманструйце супроць тэрору фашысцкай акупацыі!

Беларускія, польскія і літоўскія сяляне Заходняй Беларусі!

Вы можаце дзейна дапамагчы вашым берасьцейскім братом у іх цяжкім змаганьні. Рабоце ўсюды тое, што яны ўжо робяць некалькі месяцаў. Ніякіх падаткаў! Ніякіх шарваркаў! Не плаціць ліхварскіх і банкаўскіх доўгоў! Ніякіх фашысцкіх канфіскацый, ізаляцый і ліквідацый сэрвітутаў, з дапамогай якіх фашызм адбірае ў беднага селяніна лепшую зямлю, пасьбішчы і лес! Барыстайцеся нападам скасаваньнымі гвалтам сэрвітутамі! Бярэце дровы з памешчыцкіх і дворскіх лясоў на апал і будову! Не згаджайцеся далей пухнуць з голаду моўчкі і пакорліва! Ідзеце арганізаванай грамадой па харчы і нашу ў абшарніцкія сьвірны, ва ўрадавыя магазыны!

Супроць карных экспэдыцый змагайцеся ўсялякімі спосабамі аж да збройнай барацьбы!

Салдаты!

Становіце ў адзін рад з рабочымі і сялянамі, якія змагаюцца! Не дазвольце буржуазіі ўчыняць катаўскую работу супроць вашых братоў з фабрык і з палёў! Адмаўляйцеся ад аховы паляных судоў і ад усякай паліцэйскай службы! Дэманструйце ўсялякімі спосабамі вашу салідарнасьць з рэвалюцыйнай барацьбой працоўных мас!

Далоў крывавы фашысцкі тэрор акупантаў! Далоў экспэдыцыі і ваенна-палявыя суды!

Няхай жыве масавая палітычная забастоўка супроць фашысцкага тэрору!

Няхай жыве масавая рабоча-сялянская сямаабарона!

Стычная партыі Заходняй Цэнтральны Камітэт Камуні- Беларусі.

„НЕПАРУШНЫ БАСТЫЁН" ТРАШЧЫЦЬ

9-га сьнежня 1931 г. у Польшчы адбываўся перапіс насельніцтва. Уключаважныя камісары хадзілі па хатах у гарадох і вёсках. Хадзілі і ехалі.

Што маглі бачыць камісары? На старонкі афіцыёзнага «Ілюстраванага кур'ера цодзеннага» прарвалася некалькі вялымерна характэрных малюнкаў:

ВЁСКА...

«Маленькая хатка без падлогі. Тут жыве некалькі дарослых, некалькі дзяцей і апрача гэтага... трусы і галубы. Задуха і бруд, адсутнасьць самых неабходных прадметаў — вось што сустракае кожнага ўвайшоўшага. Пыпёра дзяцей. Усе босыя. Малыя сядзяць у галоднай кухні і плачуць— просяць есьці. На пытаньне аб прафесіі ўласьнік хаткі адказвае:

— Зямляроб.

— Колькі зямлі?

— Паўтара морга.

— Іншая прафесія?

— На жаль, ніякай. Дзе мне шукаць працы? Жадаю не вельмі, бо дзеці галодныя і абадзёртыя. Калі ў часе вайны,—гаворыць далей гаспадар, — я ваяваў на фронце, абяцалі даць зямлю. Але да сёньняшняга дня аб гэтым ніякай чуткі.

На 52 сям'і ў гэтай вёсцы большасьць такія «гаспадаркі». Астатнія —ня больш заможныя, бо маюць ледзь 2-6 моргаў зямлі...»

ГОРАД...

«...Маленькі пакойчык пад дахам. Увайшоўшага камісара сустракаюць хмары густой пары і востры пах мыла. Кучы вымытай бялізны на стале. Пад балеяй пахіленая маладая жанчына. На ложку ў кутку дзіця.

... Камісара зьдзіўляе інтэлігентны выгляд прачкі, якая просіць прабачэньня за адсутнасьць стала, дзе можна было-б пісаць.

Рубрыка «асьвета». Апісоўвае камісар піша: «гімназія».

— Прафесія?

— Да чэрвеня—настаўніца пачатковай школы, цяпер пасьля скарачэньня—прачка. У вачох жанчыны сьлёзы...»

КАЛЯДНЫ ВЕЧАР...

«На каменнай лаўцы ля маста князя Панятоўскага (у Варшаве) застрэлўся з рэвальвэру 23-гадовы Уладзімер Каравай. У кішэні самабойцы знойдзена запіска: «Я сам». Прычына самагубства—беспрацоўе і голад.

— На вуліцы Цьвёрдай атруцілася 30-цігадовая Э. Б.

— 27-мігадовы С. Ш. Зальцэйцер выпіў 20 грам воцтавай эсэнцыі.

— На вуліцы Новы Горад атруцілася атруціцца воцтавай эсэнцыяй Галена Ч.

— 65-цігадовая Эмільля Етова, без працоўная і бядотная, атруцілася воцтавай эсэнцыяй. Памерла ў больніцы.

— Пры вуліцы Сталёвай 29 павесіўся 39-цігадовы С. Турнот. Доктар пацьвердзіў сьмерць.

— 50-цігадовы Ян Хліпак атруціўся невядомай атрутай» («Робітнік», 28 сьнежня), і гэта за адзін калядны вечар...

Глыбачэзным крызісам сустракае Польшча 1932 год. Гарызонт закрыты чорнымі хмарамі. Узрываецца віхор. Грозна грыміць гром. Надыходзіць навальніца.

Як не патобна цяпер чэлячэйная праса польскага фашызму ўсіх колераў і адценьняў да тэй прэсы, якая ў свой час абвяшчала 1931 г. «годам пералому да лепшага». Прароцтвы праваліліся. 1931 год прынёс далейшае гіганцкае паглыбленьне крызісу. Ахопленая панікай, буржуазія нічога добрага не чакае ад надыходзячага году.

Сумна зьвіняць калядныя і новагодзія званы... Няма спакою, няма надзеі на паляпшэньне. Зьвярыны страх падхлістае буржуазных і сацыял-фашысцкіх пісак выпускаць сродкі для выратаваньня свайго безнадзейна хворага пацыента—капіталізму:

«Даволі зьнішчаць так, як у часе вайны, адрываць стольні людзей ад прадукцыйнай працы», —праліваё сьлёзы на старонках «Газэты польскай» вядомы эканаміст Польшчы Матушэўскі.

За кулісамі ідзе новагодняя праграма выратаваньня капіталізму. Праграма знаёмая. Яе ўжо ажыцьцяўляюць амэрыканскія памешчыкі і бразільскія плянтатары, якія палюць, зьнішчаюць, выкідваюць у мора сотні тысяч тон пшаніцы і кавы. Сутнасьць праграмы—спыніць усякую вытворчасьць, каб выклікаць... голад на тавары. І за гэту праграму зьнічэлыя эканамісты капіталу хапаюцца, як тапелец за саломінку. Можа дапаможа, можа выратуе:

«... сьвет бязумоўна ЗЬЯДЗЕ НЕ на тавары, будуць расьці цэны,— пацягнае далей Матушэўскі. — Тольні пытаньне, ЯК ДОЎГА трэба такое станавішча ўтрымліваць. Калі вайна ішла 4 гады, пры вялізарным напружаньні зьнішчальнай здольнасьці,—дык шмат гадоў трэба НЕ ПРАЦАВАЦЬ, каб дасягнуць пасьляваеннага ўзроўню цэн».

І так «выхад» знойдзен. Беспрацоўныя, хутчэй памірайце з голаду. Хто яшчэ мае работу, кідайце працаваць. Не патрабуйце хлеба і працы, а чакайце, чакайце, пакуль «сьвет зьбяднее на тавары...»

У зьнявоне б'ецца польская буржуазія. Зьвярынай злосьцю блішчаць вочы, на вусах—пена. Якія, адкак, нетактычныя людзі гэтыя рабочыя і беспрацоўныя. Ня хочуць памірацьз голаду і толькі. Ніякай пашаны да рацыяналаў панаў Матушэўскіх. Ніякай згоды чакаць, пакуль сьвет канчаткова «зьбяднее». Замест далікатнага чаканьня галоднай сьмерці—стачкі і забастоўкі. Сьцягнуты чубы, на сьмерць перапалоханы буржуа з роспачаю енчыць, што там у краіне Саветаў:

«... будуецца новае жыцьцё, новы сьвет, думкі перарабляюцца і мяняюцца стварацца новы тып чалавечай псыхалёгіі. Вера ў дабро камуністычных пачынаньняў, магутная воля перамогі над старым сьветам—вось стыхійныя законкі, якія ідуць да нас з Усходу» («Кур'ер Віленскі», 25-га сьнежня).

Гэта там, у «барбараў-бальшавікоў», а тут, у Польшчы, у так званым «заплоце цывілізацыі», у «культурнай» Эўропе:

«... роўным крокам ідзе замяшанае заходніх грамадзтваў, пачынаючы шадоўс перапрадукцыі і голаду, ня кажучы пра цывілізаванае чалавецтва.

Чуюцца трывожныя галасы аб недалёкім і неміннучым упадку ўсходняе - зўрапэйскай культуры» («Кур'ер Віленскі»).

Голад, «перапрадукцыя», «неміннучы ўпадак культуры»—вось пароны тыны рупара польскага фашызму. З бязьмежнай паніцы «Кур'ер Віленскі» пачынае махаць кулакамі:

«Мы жывем у Польшчы, на першай лініі акопаў, мы знаходзімся ў Вільні на найбольш выступных пазыцыях...

Вільня — гэта непарушны бастыён, аб які разабіецца кожная хваля».

«Газэта польска» выказвае тое, чым думаў і марыў, але ня выказаў «Кур'ер Віленскі». «Газэта польска» так скавалі, дапаўняе праграму выратаваньня капіталізму. Дапаўненьне знаёмае, імя яму—**ІНТЭРВЭНЦЫЯ:**

«... Пакуль над Віслай не зьмыцуе свайго панаваньня бальшавікі тапор, датуль сьвету не пагражае перавароту у яго найбольш гнілай і яркай форме. Каб супрацьленьне магло даць станоўчыя вынікі, неабходна мабілізаваць усе творчыя сілы, усю маральную мо народу, неабходна мабілізаваць усе таленты і характары, усе ініцыятэлекты, усю шчырасьць і волю».

Жандар Эўропы грозна брацца зброяй. Мабілізуюцца ўсе сілы фашызму. З заміраньнем сэрца інтэрвэнты чакаюць сыгналу...

САРВЕЦЦА!

З гарадоў і вёсак узьнімаецца суцэльная хваля. Мільённыя рабочых сялянскія масы Польшчы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі! Польшчы рыхтуюцца да рашаючых баёў з дыктатурай фашызму. Плянны інтэрвэнтаў будуць перакрэсьлены.

САРВЕЦЦА!

Праўдзін

Два з пяці

Імчыцца пятгодзьдзе... Гады ўпартай барацьбы і працы бягуць адзін за другім. Ці даўно быў 17-ты? Ужо 32-гі. Чацьверты і апошні Вялікай Пяцігодкі. Год новых перамог і дасягненьняў рабочай клясы і мільёнаў калгаснікаў Савецкага Саюзу, год новых гігантаў індустрыі і рашучага ўзмацненьня калгаснага сэктару, год новых посьпехаў у галіне пралетарскай культуры, камунальнай гаспадаркі, жыльлёкага будаўніцтва, дабрабыту працоўных мас і—у той-жа час—год далейшага паглыбленьня пячуванага крызісу ў капіталістычных краінах, год далейшых банкрутстваў, крахаў, беспрацоўя, патрасеньняў — там, па той бок чырвонай мяжы.

Вокам адразу ўвесь шлях не акінеш. Вырасьлі новыя фабрыкі, заводы, электрастанцыі, школы, унівэрсытэты, клюбы, бібліятэкі, тэатры, сталовыя, фабрыкі-кухні, пральні, лазьні, цамы — шматпавярховыя, шматкватэрныя. Адбудаваліся гарады, заблішчалі электрычнымі сонцамі, загрымелі трамваямі, загудзелі сырэнамі тысяч, дзесяткаў тысяч аўтамашын, апрануліся ў асфальт вуліцы і тратуары. Вырасьлі саўгасы, калгасы, камбінаты. Не пазнаць гораду, не пазнаць вёскі. Уся краіна — у вопратцы будаўнічых рыштаваньняў.

Будуем, будуем, будуем...

***

Будуем культуру — нацыянальную па форме, пралетарскую па зьмесьце

Мы папярэдні найвялікшай падзеі ў гісторыі працоўных мас Беларусі. **Да 1-га мая 1932 г. БССР будзе краінай суцэльнай пісьменнасьці.**

Вызваленыя Кастрычніцкай рэвалюцыяй ад ярма фабрыканта і памешчыка, працоўныя масы літаральна рынуліся ў бой за вучобу, за веды. Вучацца ў школах, у рабфаках, унівэрсытэтах, за варштатам, дома—дзе толькі магчыма. Ня так даўно народны камісар асьветы тав. **Платун** на пленуме Менскага гарсавету заявіў, што ў Менску кожны трэці **чалавек вучыцца.** Гэтымі днямі ў Наркамасьвеце быў праблем дакладны паллік і аказалася, што з 5 млн. чалавек насельніцтва

у Іншы	на 1000 ч.	нараджаецца	33	і памірае	24,	або 72 проц.,
» Баўгары	» 1000 чал.	»	36,9	»	19,2	» 52 »
» ПАЗШ	» 1000 чал.	»	21,4	»	11,8	» 55 »
» у БССР	» 1000 чал.	»	**36,4**	»	**14,2**	» **39** »

Старая Расія заўсёды стаяла на першым месцы па колькасьці дзіцячай сьмяротнасьці. Цяпер «цывілізаваныя» краіны яе абагналі. Але возьмем БССР.

У 1908-10 г. г. дзіцячая сьмяротнасьць на тэрыторыі цяперашняй БССР складала —

17,9 проц.;

у 1928 г. (ня гледзячы на год дзіцячай інфэкцыі) дзіцячая сьмяротнасьць зьнізілася да—

9,4 проц.

І калі 1928 год у параўнаньні з 1911-13 г. г. дае па БССР прырост насельніцтва з 19.4 па 1.000 да 22,2, дык у Германіі ка апошніх даных прырост насельніцтва ўпаў з 5,4 на 1.000 да 4,2 (1921-1924 г. г. і 1925-30 г.).

Адзін толькі гэты факт, ня лічачы могул вялізарнай розьніцы ў прыросьце насельніцтва (22,2 і 4,2) сам **гаворыць ЗА сацыялізм, СУПРОЦЬ капіталізму.**

***

Будуем новы быт.

Ці-ж можна побач з шматлікімі іншымі паказальнікамі прайсьці міма значнага памяншэньня злачынасьці. Да, злачыннасьць, зьнікае. Дзе цяпер афэрысты, злодзеі, зломшчыкі, грабіцелі, капакрады — «добрага, старога часу»? Толькі так званых аседлых злачынцаў — прафэсыяналаў было ў старым Менску па статыстыцы крымінальнага вышуку каля 200 чал. Гэта ня лічачы прафэсыяналаў-падпалышчыкаў, на дапамогі якіх часта зьвярталіся дамаўласьнікі для атрыманьня страхоўкі; ня лічачы карцёжнікаў - прафэсыяналаў, гастраляраў і г. д. Ад шаек маладых «карманшчыкаў» ня было праходу. Не праходзіла ночы, каб ня было кваліфікаванай пакражы са ўзломам. У кожным горадзе — скупчышчы крадзенага са спэцыяльнай сеткай агентаў — «пасэраў». Адных дамоў распусты, так сказаць, афіцыяльных, юрыдычна, афармленых, якія карысталіся патураньнем царскага закону і «самога» паліцэйстэра—было каля 25.

Савецкае законадаўства, савецкія суды, работа чырвонай міліцыі, паліткна перавыхаваньня злачынцы, ліквідацыя беспрацоўя, рост дабрабыту краіны — адбілася на злачынным памяншэньні крымінальнай злачынасьці. Амаль зусім зьніклі кваліфікаваныя пакражы са ўзломам, зьнікаюць кадры, якія займаліся прафэсыянальным разбоем, аседлых злачынцаў у Менску зараз амаль няма, рэдкасьцю зьяўляецца і шайка малалетніх «карманшчыкаў», рэзка ўпала прастытуцыя, амаль зусім ліквідавана бясьпутальнасьць і г. д.

Капакрадзтва, якое ў стары час пасіла магавы характар і было сапраўдным бічом для бедняка - селяніна, зараз значна зьнізілася.

У сацыялістычнай краіне, дзе ліквідавана беспрацоўе, дзе зьнішчана ўлада экспляататараў, дзе заводы і фабрыкі знаходзяцца ў руках пралетарыяту, дзе разгортваецца суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя на гэтай аснове кулацтва як клясы, зьнішчаны ўмовы, якія параджалі крымінальныя злачынствы.

Гэтыя посьпехі мы атрымоўваем у жорсткай барацьбе з кулаком, наймнам, шкоднікам, якія шалёва супраціўляюцца сацыялістычнаму наступу.

Органы дыктатуры пралетарыяту моцна стаяць на варце інтарэсаў рабочых і працоўных вёскі.

***

Імчыцца пятгодзьдзе рэвалюцыі, бягуць гады. На парозе — 1932-гі. Год новых перамог, новых дасягненьняў, новых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Неадкладна выканаць пляны загатовак насеньня кармовых траў і кораньплодаў

УСІМ САКРАТАРОМ РК КП(б)Б І СТАРШЫНЯМ РВК

Загатоўкі насеньня кармовых траў, кораньплодаў і гародніны зрываюцца. Прапануем у сутачны тэрмін праверыць працу загатоўчых арганізацый і вінаватых, за бязьдзейнасьць прыцягнуць да адказнасьці. Забясьпечце выкананьне пляну праз безадкладную здачу насеньня траў, кораньплодаў, гародніны па кантрактацыі калгасамі, вёскамі. Безадкладна забясьпечце спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных дваароў.

Сакратар ЦК КП(б)Б **ШАРАНГОВІЧ.**
Намесьнік старшыні СНК **А. КАЛНІН.**

Я. Папескі

Фабрыка мяса

...Здалёк ад сядзібы, на ўзгорку забялёлі пакрытыя сьнегам сьвінарнікі саўгасу **Лемніца.** Сустрэчны парывісты вецер сьпірае дыханьне. Тлумачэньні дырэктара саўгасу т. Анціпенкі даносяцца толькі ўрыўкамі:

— Наша стада пераваліла ўжо за дзесятую сотню. Укамплектаваньне праведзена ў значнай ступені за лік прыплоду. Пляны мы выканалі. 301 матку і 16 кныроў мае ўжо наш саўгас. Заданьне трэсту — 300 матак і 10 кныроў...

— 155 сьвінак самі выгадавалі. Гэта — рэзэрв, які ў бліжэйшы час папоўніць прамысловае стада гаспадаркі.

***

Адзін супроць другога стаяць у рад 5 сьвінарнікаў. Заходзім у сьвінарнік № 4 У прасторных станках—96 матак, якіх даглядае сьвінарка **Папалава.** З кастрычніка работа ў сьвінарніку **перавэдзена на прагрэсыўку.** Улічваюцца якасныя паказальнікі (адыход, злучка, утрыманьне і г. п.). Раней тут працавалі дзьве сьвінаркі. Пасьля пераходу на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну Папалава адна спраўляецца з усёй работай.

У лістападзе ў сьвінарніку ня было ніводнага выпадку адыходу. Гэта бяручы пад увагу пры выплаце пэнсіі. Папалава атрымала за захаваньне стада 15 руб. Сьвінар **Вавілаў Арсень** сам даглядае 98 матак, 14 кныроў і 28 маладых сьвінак. **Ён поўнасьцю захаваў стада.** Арсень уважліва і добрасумленна выконвае сваю работу. За захаваньне стада ён, як і Папалава, атрымаў узнагароду.

РЭЗУЛЬТАТЫ ПРАГРЭСЫЎКІ: дзе раней працавалі 24, зараз працуюць 17 чал. Зарплата вырасла на **15 проц.** Пасьля ўвядзеньня прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны крывая адыходу **пашла ўніз.** Гадавы прыпант адыходу маладняка ў саўгасе—17.

Надаўна саўгас правёў актыўную прышчэпку супроць чумы. 10 дзён увесь сьвіны цэх разам з атрадам ВЭТ бесьперапынна дзяжурыў у сьвінарніках. Людзі літаральна валіліся ад стомленасьці, затое стада саўгасу **імунізавана.** Актыўная прышчэпка дала ў сярэднім 7-8 проц. адыходу сярод парасят. Вопыт Лемніцы ярка вучыць, што пры настойлівай барацьбе і правільным ужываньні дасягненьняў вэтэрынарыі **эпізоатыі будуць пераможаны.**

***

Тэхнік **Ляхаў** — малады савецкі спэцыяліст. На спэцыяльных курсах Ляхаў атрымаў асноўныя веды і практычныя навыкі па тэхніцы сьвінагадоўлі і арганізацыі буйных жывёлагадоўчых гаспадарак.

Прыйшоўшы ў саўгас Ляхаў адразу сустрэў адсталыя традыцыі, перанесеныя сюды з дробнай сялянскай гаспадаркі. Сьвінаматкі з парасятамі былі разьбіты па асобных станкох, што значна ўскладняла і пагоршвала догляд іх.

Перадавыя сьвінасаўгасы Саюзу перайшлі ўжо па групавое ўтрыманьне падсосных матак з парасятамі. Гэты мэтад Ляхаў парашыў ва што-б там ні стала ўжыць у сваім саўгасе. Пытаньне абмеркавалі са сьвінаркамі. Потым — перайшлі да практычнай работы. Загадзя былі адабраны 6 матак і 31 парасё аднолькавага ўзросту. Іх перавялі ў прасторны станок, дзе раней утрымліваўся маладняк. Праз дзень туды паставілі яшчэ 5 матак і 32 парасят. Сьвіньні хутка асвоіліся і мірна бегалі па станку. Парасяты перамяшаліся і забылі пра сваіх матак. На працяту трох дзён у гэтым станку ня было ні аднаго выпадку адыходу.

Праведзенае мерапрыемства дало значны эфэкт. Ліквідавана абязьлічка ў доглядзе станкоў. Сьвінарка абслугоўвае адзін станок замест ранейшых 5-7 адразу. Зьмяншаецца зьдыханьне парасят. У вялікім станку яны ўвесь час у руху, што добра ўплывае на іх арганізм. Пры групавым утрыманьні ўсе парасяты аднолькава налодзены.

***

Саўгас Лемніца на 1-га сьнежня выканаў план здачы таварнай прадукцыі на 75 проц. У бліжэйшыя дні будуць зданы дзяржаве 85 адкормленых на бэкон і дзьвінкаў і 21 —га сала. У канцы 1932 году ў гаспадарцы будзе 3.500 шт. сьвіней, у тым ліку 700 матак.

У працэсы саўгасу ёсьць і «дробязі», якія зьніжаюць вытворчы эфэкт. Дагэтуль, напрыклад, сьвінарнікі не даволі ацеплены. Бываюць выпадкі, калі зрываецца своячасовае кармленьне сьвіней.

Ліквідацыя гэтых «дробязей» забясьпечыць далейшы рост сьвінасаўгасу.

Амэрыка патрабуе сваёй часткі здабычы ў Манчжурыі

Форбс пратэстуе супроць парушэньня прынцыпу „адкрытых дзьвярэй"

ТОКІЁ. Паводле паведамленьняў агенцтва Сінбун Рэнга, Форбс (амэрыканскі пасол у Токіё), атрымаўшы 27 сьнежня японскі адказ на мэмарандум ПАЗШ, паказаў японскаму міністру замежных спраў Нагай, што дзеяньні японскіх войск у Манчжурыі парушаюць прынцып адкрытых дзьвярэй.

Нагай адказаў, што японскі ўрад цьвёрда прытрымліваецца прынцыпу «адкрытых дзьвярэй» у Манчжурыі. Цяперашняе становішча ў Манчжурыі — пераходнае і толькі «непрадкі» на дні канчаткасьці ажыцьцявіць поўнасьцю прынцып «адкрытых дзьвярэй».

Чаму манэўры флёту ПАЗШ адбудуцца ў Ціхім акіяне

ТОКІЁ. Газэта «Іородзу» ў перадавой кампэтэнтнай паведамленьне аб скасаваньні амаль усяго флёту ПАЗШ у Ціхім акіяне для манэўраў. Паводле слоў газэты, працэдурнікам ПАЗШ мыслілася Японія.

Акупацыя Хазаляпу

ТОКІЁ. Паводле вестак друку, хынізія Тамона ўчора вечарам заняла Хазаляпу — важнейшы стратэгічны пункт чыгункі Інькоу-Гэўбанцзы.

Баі ўздоўж Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі

ШАНХАЙ. Японцы пачалі далейшае прасоўваньне на захад уздоўж Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. Прасоўваньне пачалося адначасова ад Сіньміня і Пакіньня.

Недалёка ад Байцзіху, на паўднёвы захад ад Сіньміня, адбылася сутычка з кітайскімі войскамі. Рэзультат жорсткага бою паміж японскімі ўзброенымі і кітайскімі часьцямі пакуль невядомы.

Эвакуацыя Цзінчжоу

ШАНХАЙ. Кітайскія войскі, якія эвакуіраваліся з Цзінчжоу, пачынаюць прыбываць у Шанхайгуань. Праз Шанхайгуань прайшло ўжо 5.000 кітайскіх войск.

Зьмест японскай ноты

БЭРЛІН. Як паведамляюць з Жэнэвы, там атрымана і апублікавана адказная нота японскага ўраду на мэмарандум урадаў Амэрыкі, Англіі і Францыі.

Нота, якая налічвае дзьве тысячы слоў, прадстаўляе сабою спробу апраўдаць апошнія японскія ваенныя акцыі ў Манчжурыі. Адначасова ёй дэкляруюцца далейшыя ваенныя акцыі пад прадлогам славутай «барацьбы супроць бандытызму».

Кантонская групоўка супроць абраньня Чан-Кай-шы

ШАНХАЙ. Газэта «Чайна прэс» паведамляе, што ўключэньне Чан Кай-шы ў склад вышэйшых органаў грамадзянскага і панкінскага ўраду выклікала модны пратэст з боку палітычных і ваенных лідэраў кантонскай групоўкі.

У Панкін пасылаецца тэлеграма, якая настойвае на анулюваньні абраньня Чан Кай-шы, а таксама рэкамэндуе назначэньне Фын Юй-сяна на пост старшыні савету нацыянальнай абароны.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

Гомсельмаш павышае тэмпы

ГОМЕЛЬ. 28 сьнежня Гомсельмаш выпусьціў 30 сіласарэзак—125 проц. пляну, 26 сячкарань — 118 проц. пляну і 17 бульбамлек — 130 проц. пляну.

Бабруйскі камбінат паказвае ўзоры вытворчай работы

БАБРУЙСК. 27 сьнежня стандартны цэх Бабруйскага камбінату да тэрміну скончыў выкананьне прамфінпляну 4-га кварталу. Лесацэх камбінату да 4 гадз. дня 30 сьнежня выканаў праграму 2-га паўгодзьдзя. 27 сьнежня цэх скончыў выкананьне экспартнай праграмы 4-га кварталу.

Бела-дрэўны цэх камбінату 30-га сьнежня поўнасьцю выканаў экспартны плян штурмавога месячніка.

На 25,6 проц. больш заданьня

МАГІЛЕЎ. Рабочыя апрадоўчага цэху магілеўскай гарбарні імя Сталіна, дзякуючы мабілізацыі мас на штурм адставаньня, перавыканалі вытворчае заданьне на 25,6 проц.

5 цэхаў аўтазаводу зданы ў эксплёатацыю

НІЖНІ НОЎГАРАД. 5 цэхаў аўтазаводу — каляровага ліцьця, пэрэгага чыгуну, рамонтна-ліцейны, рамонтна-мэханічны і стрыжнёвы зданы ў эксплёатацыю і ўжо выпускаюць прадукцыю.

Адказны рэдактар—**М. ГАРЫН**

Менск, друкарня газ. «ЗЬВЯЗДА».

Галоўлітбел № 377